16+

Літ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 40 (5249) 6 кастрычніка 2023 г.

ISSN 0024-4686

Праз гісторыю — да ісціны
стар. 4

Крыніцы энергіі і натхнення
стар. 11

Погляд на краіну Беларусь
стар. 12

Падзяліцца радасцю творчасці

Фота з сайта e-vid.ru

Помнік Салавату Юлаеву ва Уфе.

Башкартастан — цудоўны рэгіён Расійскай Федэрацыі, мядовы край, дзе ёсць горы і раўніны, рэкі і азёры, вадаспады і пячоры. А першае імя, якое прыходзіць на розум, калі чуеш пра гэтую рэспубліку, несумненна, Салават Юлаеў — башкірскі нацыянальны герой і паэт-імправізатар. Салават апяваў у сваіх творах родныя ўральскія прасторы, народ і яго старажытныя звычаі, святую веру продкаў. Не чужыя гэтыя тэмы і сучасным башкірскім пісьменнікам.

З 10 да 12 кастрычніка ў Беларусі будуць праходзіць Дні башкірскай літаратуры. У госці да нас прыедуць паэты, празаікі, перакладчыкі, публіцысты з Уфы. Башкірскія пісьменнікі сустрэнуцца з беларускімі калегамі, наведаюць рэдакцыі грамадска-палітычных і літаратурна-мастацкіх медыя, пабываюць у літаратурных музеях Мінска, паўдзельнічаюць у круглых сталах і творчых вечарынах, выступяць перад беларускімі чытачамі ў самых розных аўдыторыях.

У сучаснай літаратуры Башкартастана нямала твораў самых розных жанраў, вядомых далёка за межамі роднага рэгіёна. З некаторымі з іх мы прапануем пазнаёміцца на старонках гэтага нумара газеты.

Працяг тэмы на стар. 6—11 ▸

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў сферы адукацыі з прафесійным святам. «Мы шчыра дзякуем педагогам і выхавальнікам за адданасць справе, любоў да дзяцей, прыклад мудрага стаўлення да жыцця. У вашых руках будучыня Беларусі. Прывіваючы моладзі любоў да ведаў, выхоўваючы павагу да спрадвечных каштоўнасцей, фарміруючы беражлівае стаўленне да гісторыі роднай зямлі і гонар за дасягненні краіны, вы ствараеце і ўмацоўваеце асновы дзяржаўнасці», — падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы. Звярнуўся Аляксандр Лукашэнка і да маладых спецыялістаў у гэтай сферы: «Перакананы, абапіраючыся на вопыт старэйшых настаўнікаў, захоўваючы пераемнасць традыцый нацыянальнай школы, вы зробіце ўсё, каб павысіць імідж айчыннай адукацыі, якая заслужана прызнаецца адной з найлепшых у свеце».

Юбілей. Народны артыст Беларусі Уладзімір Громаў адзначыў юбілей на сцэне Вялікага тэатра, перадае БелТА. У гонар яго 50-годдзя адбыўся паказ оперы «Яўгений Анегін» П. І. Чайкоўскага. Міністр культуры Анатоль Маркевіч павіншаваў Уладзіміра Громава і адзначыў яго самаадданае служэнне беларускай культуры і мастацтву, роднай краіне і сцэне Вялікага тэатра Беларусі. Да таго ж артыст атрымаў Ганаровую грамату Нацыянальнага сходу Савета Рэспублікі за ўклад у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі краіны і развіццё нацыянальнай культуры.

Кіно. Студыя дакументальнага кіно «Летапіс» рыхтуе сумесны праект з Генеральнай пракуратурай, інфармуе БелТА. «Наша кінастудыя рыхтуе кінадакументы — фільмы, якія захоўваюць для нашчадкаў гісторыю краіны ў зрокавых вобразах. У гэтым заключаецца асноўная задача кінадакументалістаў, — расказала дырэктар студыі Аксана Эйхарт. — Тэматычна мы ахопліваем самы шырокі спектр жыцця беларускага грамадства, куды ўваходзіць гісторыя Беларусі, падзеі Вялікай Айчыннай вайны, сацыяльнае жыццё і выдатныя асобы краіны, прырода, спорт і самыя значныя падзеі гэтых дзён. Сумесна з Генеральнай пракуратурай мы ствараем цыкл фільмаў "Трыбунал памяці", які будзе складацца з некалькіх кінастужак».

Фільм «Чорны замак Альшанскі» выйдзе вясной 2024 года, паведамляе БелТА са спасылкай на генеральнага дырэктара нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрыя Аляксея. Так, цяпер ажыццяўляецца мантаж і гукавое афармленне знятага матэрыялу, вырашаюцца іншыя тэхнічныя пытанні. Фільм будуць паказваць у Расіі і на розных стрымінгавых пляцоўках. Паводле слоў гендырэктара, кінастудыя таксама прадставіць фільмы пра Белавежскую пушчу і Бярэзінскі біясферны запаведнік. «З дапамогай анімацыі ў гульнявой форме мы раскажам малодшаму пакаленню пра мемарыялы і сімвалы нашай краіны», — адзначыў Юрый Аляксей.

Ініцыятыва. Фармат тэатральнай лабараторыі «Славянскім базары ў Віцебску» пераглядаюць. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі, прысвечанай адкрыццю 98-га тэатральнага сезона ў нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа ў Віцебску, паведаміў рэжысёр-пастаноўшчык Андрэй Жыгур. Стала вядома, што шукаюцца новыя падыходы, якія дазволяць праекту заставацца цікавым для ўдзельнікаў. Падрыхтоўка да наступнага ўжо вядзецца. «Праз лабараторыю наладжваюцца вельмі добрыя адносіны з Акадэміяй мастацтваў. Прыемна, што сёлета былі высланы дадатковыя заяўкі і амаль усе ўдзельнікі 2022 года прыехалі зноў, — адзначыў Андрэй Жыгур. — Лабараторыя развіваецца і пашыраецца. Спадзяюся, так і прадоўжыцца, і ў выніку мы, магчыма, выйдзем на фестывальны рух».

Тэатр. Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр праводзіць для ўсіх жадаючых экскурсіі ў свет тэатральнага закулісся. Удзельнікі могуць даведацца больш пра Музычны тэатр, яго гісторыю, пазнаёміцца з працэсам стварэння спектакляў, убачыць, як робяцца дэкарацыі і рэквізіт, дзе рэпеціруюць артысты і захоўваюцца касцюмы. Экскурсіі праводзяцца па аўторках, серадах, чацвяргах і пятніцах у 17.30. Працягласць экскурсіі — 1 гадзіна. Мінімальны ўзрост удзельнікаў экскурсіі — 10 гадоў.

• Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы і Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа правядуць абменныя гастролі. Першымі у гасцях выступяць віцебскія артысты, паказы ў Брэсце пройдуць 19 і 20 кастрычніка. Коласаўскі тэатр прадставіць меладраму «Гісторыя кахання» і камедыю «Фантыкі». Для дзіцячай аўдыторыі прызначана лірычная казка «Шэрая шыйка». Гастролі БАТД у Віцебску запланаваны на 9 і 10 лістапада. Брэсцкая трупа прадставіць камедыю «Праўда — добра, а шчасце лепш» і камедыю-фарс «Адчайныя цёткі». На юных гледачоў разлічаны музычны спектакль паводле казкі «Царэўна-лягушка».

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

за падзеяй

Карэлічы фестывальныя

Фестываль «ПРОдвижение КНИГИ. Библиотечные ступени» прайшоў у гарадскім пасёлку Карэлічы. Сёлета кніжнае свята, арганізаванае калектывам Карэліцкай раённай бібліятэкі на чале з Ліліяй Арцюх, было прысвечана Году міру і стваральнай працы.

У праграме фестывалю, удзел у якім прынялі Навагрудская, Воранаўская, Нясвіжская і Ляхавіцкая раённыя бібліятэкі, было нямала мерапрыемстваў, скіраваных на папулярызацыю кнігі, на разгляд розных бібліятэчных навацый. Дарэчы, у фармаце анлайн у свяце прыняла ўдзел і Уздзенская раённая бібліятэка. Перш-наперш былі прэзентаваны бібліятэчныя пляцоўкі: «Бібліятэка як брэнд», «Прасоўванне бібліятэкі ў сацыяльных сетках», «База даных уласнай генерацыі».

Праходзіў продаж кніг кніжных і медыйных выдавецтваў. Шкада, што на свяце іх было ўсяго толькі тры: Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура» і рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Адукацыя і выхаванне», апошняе з якіх пазнаёміла не толькі з папулярнымі асветніцкімі выданнямі, але і прадставіла часопіс «Рюкзачок». Магчыма, з часам да кніжнага свята далучацца і іншыя дзяржаўныя і прыватныя выдавецтвы.

У СШ № 1 г. п. Карэлічы прайшла сустрэча са старшынёю Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі паэтам і празаікам Людмілай Кебіч, якая прадставіла сваю новую кнігу прозы «Жыццёвыя путы», зборнік пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда». Удзел у сустрэчы прыняў і паэт Мікалай Іваноўскі. Таксама на фестывалі была прэзентавана кніга мясцовага краязнаўца Святланы Кошур «Праз паціну часу» («Звязда»).

Кацярына Хадасевіч-Лісавая прэзентавала свае новыя кнігі, якія сістэмна выходзяць у Выдавецкім доме «Звязда». Пісьменніца расказала гаспадарам фестывалю і яго гасцям з розных куткоў Гродзеншчыны, Міншчыны і Берасцейшчыны і пра свае творчыя планы. Яшчэ адзін аўтар Выдавецкага дома, прадстаўляючы свае кнігі, займеў шырокую чытацкую ўвагу, — размова пра Дзмітрыя Нікалаева. Сустрэча з ім сабрала нямала прыхільнікаў творчасці дзіцячага пісьменніка. Пра свае новыя кнігі, што выйшлі ў «Звяздзе», расказаў паэт і празаік, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура», галоўны рэдактар часопіса «Полымя», старшыня секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Шніп. «Кастусь і Міёна», «Заўтра была адліга-3», «Васільковы мёд» — назвы толькі некаторых з іх.

Раман СЭРВАЧ

прэзентацыі

«Залатая калекцыя»: Пятрусь Броўка і Пятро Глебка

26 верасня ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя кнігі «Выбраныя творы: Пятрусь Броўка, Пятро Глебка» — 25-га тома серыі «Залатая калекцыя беларускай літаратуры».

Апекаваліся ім выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Збор склалі вершы і паэмы Петруся Броўкі (1905—1980) і Пятра Глебкі (1905—1969).

Мадэратарам імпрэзы выступіла загадчык аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, доктар філалагічных навук Ганна Кісліцына. Даследчыца абгрунтавала выбар постацей, чые творы сталі абавязковымі і этапнымі ў «Залатой калекцыі» найбуйнейшага беларускага выдавецтва, падкрэсліўшы важнасць захавання спадчыны розных генерацый літаратараў, каб у кожнага пакалення была магчымасць з ёй пазнаёміцца.

Вынікі чатырохгадовай працы прадставіла ўкладальніца, аўтар пасляслоўя і каментарыяў, навуковы супрацоўнік аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Юлія Масарэнка. Навуковец распавяла, што яе знаёмства з творчасцю Петруся Броўкі пачалося яшчэ з дзяцінства, а далей — пры навучанні ў аспірантуры. У тым ліку і з кнігі Петруся Броўкі «Каландры» (1931), выратаванай ад здачы ў макулатуру ў 1960-я гады пісьменнікам Алесем Масарэнкам (1938—2019), бацькам Юліі Аляксандраўны.

Укладальніца падкрэсліла, што акадэмічныя зборы твораў Петруся Броўкі і Пятра Глебкі друкаваліся ў 1970—1980-я гады, а таму паўстала неабходнасць актуалізацыі навуковай суправаджальнай інфармацыі, звярнула ўвагу на многія дэталі, якія патрабавалі ўдакладнення, напрыклад, даты напісання асобных тэкстаў, іх розныя рэдакцыі. Як распавяла Ю. Масарэнка, была выканана праграма-мінімум і праграма-максімум: трэба было ўкласці ўсё найлепшае ў абмежаваны аб'ём за сціслы прамежак часу. Максімум вытрыманы і ў тым сэнсе, што Пятрусь Броўка і Пятро Глебка прызнаныя і вядомыя на ўвесь свет перш за ўсё як выбітныя лірычныя паэты, і іх творы, што змясціліся ў гэтым выданні, займелі сучасную аблямоўку, дапаўненне ў выглядзе неабходных каментарыяў. Былі адзначаны і акалічнасці тэксталагічнай працы, што вымагала звароту да архіўных матэрыялаў.

Укладальніца падзякавала ўсім, хто паспрыяў выданню, асабліва калектыву выдавецтва «Мастацкая літаратура», аддзелу, у якім працуе, навуковаму рэдактару тома Я. А. Гарадніцкаму і супрацоўнікам Літаратурнага музея Петруся Броўкі.

Слова мелі таксама супрацоўнікі Літаратурнага музея Петруся Броўкі, чые фонды далі магчымасць адшукаць ці ўдакладніць многія факты.

Прысутныя змаглі паўдзельнічаць у дыскусіі. Прыемным завяршэннем прэзентацыі стала наведванне мемарыяльнага кабінета Пятра Глебкі.

Марына ВАРАБЕЙ
Фотаздымак Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

актуальна

Выдавецкія планы «Звязды»

У Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І. Х. Каладзеева адбылася сустрэча з дырэктарам — галоўным рэдактарам Выдавецкага дома «Звязда», старшынёю Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесем Карлюкевічам. Размова з бібліятэкарамі горада і раёна ішла пра кнігі, якія пабачаць свет у Выдавецкім доме ў 2024 годзе.

Кіраўнік выдавецтва расказаў пра асноўных аўтараў, над кнігамі якіх работа ідзе не першы год. Гэта Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Ганна Чыж-Літаш, Алена Стэльмах, Павел Гушынец і іншыя сучасныя пісьменнікі. Бібліятэкары актыўна цікавіліся выданнем мастацкай літаратуры, якая прадстаўлена, вывучаецца ў школьнай праграме, уключана ў праграму пазакласнага чытання. Акрамя кніг серыі «Школьная бібліятэка», якія стопрацэнтна трапляюць толькі ў школьныя бібліятэкі, Выдавецкі дом «Звязда» з разлікам на школьнікаў і настаўнікаў, якія выкладаюць беларускую літаратуру, прапануе бібліятэкам кнігі пад вокладкай «Школьная бібліятэка класікі». Яны паступаюць у публічныя кніжніцы краіны без усялякіх абмежаванняў.

Сярод пытанняў, якія агучваліся на сустрэчы ў Барысаве, было і зацікаўленне лёсам некалі запланаванага «Беларускай Энцыклапедыяй імя Петруся Броўкі» энцыклапедычнага даведніка «Краязнаўства». У свой час раённая бібліятэка прадставіла выдавецтву інфармацыю пра рэгіянальнае развіццё краязнаўства. Відавочна, што даведнік «Краязнаўства» знайшоў бы свайго чытача і ў Барысаве, і па ўсёй краіне.

Кірыл ЛАДУЦЬКА

стасункі

Прыляцелі «Журавлі»

2 кастрычніка ў Доме літаратара ў Мінску адсвяткавалі 100-годдзе з дня нараджэння славутага дагестанскага паэта Расула Гамзатава. Свята наведала высокая дэлегацыя на чале з прэм'ер-міністрам Дагестана Абдулмуслімам Абдулмуслімавым, а таксама муфцій саборнай мячэці Мінска, прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі і яго старшыня Алесь Карлюкевіч.

Міністр культуры Рэспублікі Дагестан Зарэма Бутаева падчас цырымоніі ўзнагароджання.

Праграма была пабудавана так, каб падкрэсліць, што творчасць Расула Гамзатава аб'ядноўвае народы. Пачаўся юбілейны вечар дагестанскім танцам у выкананні беларускага школьніка Васіля Астрамецкага.

У прывітальнай прамове прэм'ер-міністр Рэспублікі Дагестан Абдулмуслім Абдулмуслімаў зачытаў урыўкі з дзённікаў і твораў Расула Гамзатава і дадаў:

— Расул Гамзатавіч называў Беларусь «адрасам любові, якая не старэе», вельмі любіў гэтую краіну і паважаў яе жыхароў. Пасля наведвання беларускіх гарадоў і вёсак ён не мог застацца абыякавым: амаль адразу напісаў «Размову ў купэ», стварыў зборнік «Беларускі сшытак». І сёння дагестанцы шануюць сяброўства і нават братэрства з беларусамі.

На вечарыне гучалі чулыя і пранікнёныя вершы Расула Гамзатава на яго роднай аварскай мове і ў перакладзе. Так, вядучы і арганізатар вечара Хізры Асадулаеў, старшыня аб'яднання «Горо», паэт і скульптар, зачытаў і верш Гамзатава на аварскай мове, і сваё прысвячэнне славутаму паэту на рускай. А Анатоль Аўруцін прымусіў гледачоў праслязіцца, зачытаўшы ўрывак з паэмы на смерць каханай жонкі паэта Пацімат, якую нядаўна пераклаў на рускую мову. Жонцы была прысвечана і «Калыханка» ў выкананні Аляксандра Валодчанкі. Сярод творчых нумароў былі таксама святочны дагестанскі танец групы «Эдэльвейсы» і гарачая лезгінка ад дзіцячага ансамбля «Сонечная Грузія».

Міністр культуры Дагестана Зарэма Бутаева ўручыла ганаровыя граматы за ўклад у культурнае развіццё і супрацоўніцтва Дагестана і Беларусі старшыні Саюза пісьменнікаў Алесю Карлюкевічу, кампазітрау Яўгену Ксяневічу, старшыні цэнтра нацыянальных культур Вользе Якабсон, вакальнай групе «Новы дзень», старшыні «Горо» Хізры Асадулаеву, танцору Васілю Астрамецкаму, а таксама кампазітару Дзмітрыю Даўгалёву, які выканаў песню на словы Гамзатава «Берегите матерей». Такое кранальнае выкананне на фартэпіяна мог падарыць толькі сам аўтар, які сапраўды адчуў кожнае слова песні.

Напрыканцы вечара муфцій саборнай мячэці Мінска Абу-Бекір Шабановіч падкрэсліў, наколькі важна ў наш няпросты час сябраваць, адчуваць адзінства з іншымі народамі, якія жывуць у Беларусі і не толькі. Ён зачытаў верш Расула Гамзатава і адзначыў, што творца таксама заўсёды казаў пра тое, як важна заставацца разам.

Кульмінацыяй вечара стала выступленне Алега Сямёнава. Ён спяваў «Журавлі» Жамчужнікава і «Журавлі» Гамзатава. Апошнюю песню ўся зала слухала стоячы. Гэта стала бясспрэчным доказам таго, што творчасць славутага дагестанскага паэта здольна кранаць да глыбіні душы, што яна жыве і яе шануюць.

Ганна РОВІНА
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

Вопыт узбекскіх перакладчыкаў

У Ташкенце выходзіць 200-томная Бібліятэка дзіцячай літаратуры народаў свету.

Уражлівая навіна з Узбекістана. Перакладчыца, літаратуразнаўца, крытык Рысалат Хайдарава з Саюза пісьменнікаў Узбекістана паведаміла пра тое, што ў іх краіне рыхтуецца да выдання 200-томная Бібліятэка сусветнай дзіцячай літаратуры. Вялікая падзея для падтрымкі дзіцячага кнігавыдання — складнік узбекскай дзяржаўнай праграмы па развіцці чытання папяровай кнігі.

— У нас і за папярэднія дзесяцігоддзі склаўся добры вопыт увагі да іншанацыянальных дзіцячых літаратур. Зразумела, напрацаваная практыка будзе выкарыстана ў новым творчым праекце, — расказвае Рысалат Хайдарава. — Але і я, і мае калегі-перакладчыкі ўжо робяць новыя пераклады. Мы лістуемся з дзіцячымі пісьменнікамі многіх краін свету. Найперш — з блізкімі да нас пісьменнікамі з постсавецкіх дзяржаў. Шмат каго з іх мы добра ведаем. Несумненна, знойдзецца месца і беларускай літаратуры. Асабіста я ўжо пераклала творы Уладзіміра Караткевіча, Генадзя Аўласенкі, Алены Масла... На рабочым стале і творы іншых беларускіх літаратараў. Найболей мяне цікавяць апавяданні, казкі, адным словам, празаічныя творы.

Застаецца чакаць тамы бібліятэкі з 200 кніг з «беларускімі старонкамі» на ўзбекскай мове. Ды і ўважліва сачыць за ўнікальным вопытам узбекскіх пісьменнікаў, перакладчыкаў і выдаўцоў. Развіццё дзіцячага кнігавыдання — найлепшая праява ў справе захавання ўвагі да чытання папяровай кнігі.

Сяргей ШЫЧКО

У знак трывалага сяброўства

У Рэспубліцы Беларусь і знакавага рэгіёна Расійскай Федэрацыі — Рэспубліцы Дагестан — у апошнія гады сфарміраваліся трывалыя літаратурныя сувязі. У значнай ступені іх арганізацыя залежыць ад ініцыятыўных членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі — паэта Хізры Асадулаева, паэта і перакладчыка Анатоля Аўруціна, паэта, празаіка і перакладчыка Міхася Пазнякова.

Шмат дзеля прадстаўлення твораў пісьменнікаў Дагестана на старонках літаратурна-мастацкай перыёдыкі і ў грамадска-палітычным друку робіць Выдавецкі дом «Звязда». На старонках газет «Звязда», «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Беларусь» неаднойчы распавядалася пра аварскую, даргінскую, лакскую, лезгінскую, кумыкскую, нагайскую, агульскую, табасаранскую і іншыя нацыянальныя літаратуры, друкаваліся пераклады твораў пісьменнікаў Дагестана на беларускую мову. З дагестанскага боку актыўнае супрацоўніцтва з беларускім літаратурным асяроддзем, з беларускімі медыя падтрымліваюць народны паэт Дагестана Анварбек Култаеў, публіцыст і кнігавыдавец, арганізатар культурна-асветніцкага жыцця на Паўночным Каўказе Марат Гаджыеў, агульскі паэт Шаміль Лутаў, кіраўнік табасаранскай секцыі Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Дагестан Сувайнат Кюрэбекава, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Дагестан Марына Ахмедава-Калюбакіна.

У знак трывалага творчага сяброўства, за высокі ўклад у развіццё беларуска-дагестанскіх літаратурных сувязей Анварбек Култаеў, Марат Гаджыеў, Шаміль Лутаў, Сувайнат Кюрэбекава, Марына Ахмедава-Калюбакіна адзначаны Ганаровымі граматамі Выдавецкага дома «Звязда». У найбліжэйшыя дні ўзнагароды з Беларусі будуць ім уручаны на кніжным фестывалі «Таркі-Таў 2023», які пройдзе ў Махачкале з 6 да 10 кастрычніка 2023 года.

Мікола БЕРЛЕЖ

З юбілеем!

Сардэчна віншуем вядомага празаіка, галоўнага рэдактара літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага часопіса «Нёман» Н. М. Касцючэнку з юбілейным днём нараджэння!

За многія гады творчай працы Наталія Мікалаеўна стварыла адметныя творы, якія палюбіліся шматлікім чытачам, высока ацэнены літаратурнымі крытыкамі, а таксама калегамі па пяры. Яе кнігі «Верба над омутом», «Время жатвы и время покояния» і інш. адзначаны высокімі літаратурнымі прэміямі, як рэспубліканскімі, так і міжнароднымі. Сярод іх — літаратурныя прэміі «Лепшая кніга года», імя І. П. Шамякіна, «Золотой Витязь».

Яе дзейнасць высока ацэнена дзяржавай: узнагароджана медалём Францыска Скарыны.

Доўгі час працавала ў рэдакцыі часопіса «Нёман», а цяпер узначальвае яе. І шмат робіць для папулярызацыі і развіцця беларускай літаратуры.

Шчыра жадаем Наталлі Мікалаеўне моцнага здароўя, новых творчых удач, поспехаў у працы, дабрабыту і шчасця ў сям'і.

Прэзідыум СПБ

«ЛіМ»-люстэрка

Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі сёння паказвае сваю эфектыўнасць. Такім меркаваннем падзяліўся першы намеснік міністра культуры, сустаршыня Экспертнага савета Валерый Грамада перад падагульняльным пасяджэннем Экспертнага савета па прэміях Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2023—2024 гады. «Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі — унікальны праект, які сёння сапраўды паказвае сваю эфектыўнасць. Узаемадзеянне ажыццяўляецца ў сферы эканомікі, а таксама ў сферы культуры. Адным з пацвярджэнняў гэтага супрацоўніцтва з'яўляецца прэмія Саюзнай дзяржавы. Палажэнне аб прэміі ўпершыню было зацверджана ў 1999 годзе, а першыя ўзнагароды ўручаны ў 2002-м. Сёння прадстаўлена пяць праектаў, якія з'яўляюцца намінантамі на прысуджэнне прэміі Саюзнай дзяржавы. Экспертны савет разгледзіць іх і прыме рашэнне аб рэкамендацыі трох праектаў, якія ўносяць уклад ва ўмацаванне дружбы і ўзаемадзеяння паміж краінамі», — расказаў Валерый Грамада.

Маладзечанцы атрымалі перамогу ў I Усерасійскім конкурсе патрыятычнай песні «Расія жыве, Расія спявае!» у Тамбове. У намінацыі «ансамблі» народны вакальны ансамбль «Менестрэлі» Палаца культуры Маладзечна заваяваў першае месца. Жаночы склад калектыву — Юлія Абрамовіч, Юлія Маеўская, Вольга Жыгуліч і Анастасія Карповіч — выканалі песню «Бессмяротны полк» на словы і музыку Яны Вайноўскай. У намінацыі «дуэты (трыа)» салісткі гэтага ансамбля Юлія Маеўская і Юлія Абрамовіч заваявалі першае месца з песняй «Крумкачы» на словы і музыку Вікторыі Чаранцовай. У намінацыі «сола» саліст Павел Данілаў заваяваў Гран-пры конкурсу, выканаўшы песню «Запаліце свечкі ў гэтай зале» на словы Уладзіміра Анціпава і музыку Андрэя Шчабуняева. Нязменным кіраўніком і заснавальнікам народнага вакальнага ансамбля «Менестрэлі» з'яўляецца Аляксандр Важнік.

Брэсцкі абласны краязнаўчы музей падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве з Дзяржаўным навукова-даследчым інстытутам рэстаўрацыі з Масквы. Дырэктар Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея Аляксей Міцюкоў адзначыў: «Дзяржаўны навукова-даследчы інстытут рэстаўрацыі — вядучая ў Расіі (думаю, і ў СНД) навукова-даследчая ўстанова, якая займаецца пытаннямі кансервацыі і рэстаўрацыі розных прадметаў, у тым ліку археалагічнай драўніны. Навукоўцы назапасілі велізарны досвед працы ў гэтым плане. Яны праводзілі кансервацыю Наўгародскага дзядзінца, археалагічнай драўніны ў музеі «Востраў-град Свіяжск». З улікам таго, што цяпер распрацаваны і ўкаранёны новыя метады, спосабы рэстаўрацыі і кансервацыі, такое супрацоўніцтва для нас будзе вялікай падмогай».

Да 8 кастрычніка ў мінскім Палацы дзяцей і моладзі праходзіць II Фестываль лацінаамерыканскай культуры. У цэнтры ўвагі такія краіны, як Венесуэла, Куба, Нікарагуа, Дамініканская Рэспубліка і Эквадор. Прадстаўлена выстаўка традыцыйных строяў і вырабаў народных рамёстваў гэтых краін. А Федэратыўная Рэспубліка Бразілія ў мастацкай галерэі Палаца дзяцей і моладзі арганізавала выстаўку работ беларускіх мастакоў «Спатканне з Бразіліяй». Сярод іншага ў праграме — тэматычныя лекцыі аб жыцці і культуры гэтых народаў, а таксама паказ мастацкіх і дакументальных фільмаў замежных краін. Арганізатарамі фестывалю выступаюць пасольствы Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла, Рэспублікі Куба, Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія, Дамініканскай Рэспублікі, Рэспублікі Нікарагуа, Рэспублікі Аргенціна, Шматнацыянальнай Дзяржавы Балівія, ганаровае консульства Эквадора, акрэдытаваныя ў Беларусі, пры садзейнічанні Міністэрства замежных спраў, Мінгарвыканкама і Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі, удакладняе БелТА.

Гастролі Сямейнага тэатра лялек «Жужа» з г. Салехард Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі Расійскай Федэрацыі пройдуць у Мінску. Паказы адбудуцца 8 кастрычніка на сцэне Маладзёжнага тэатра эстрады. Як піша БелТА, расійскі тэатр прадставіць на суд беларускага гледача ненецкую казку «Вай і Мора» (гісторыя пра хлопчыка, які адзін адправіўся ў падарожжа па прасторах бязмежнага казачнага свету). Тэатр з Салехарда ўпершыню выступіць на сцэне Маладзёжнага тэатра эстрады. Запланаваны два дзённыя паказы казкі. Адзначаецца, што беларускую публіку чакае не толькі цікавая пастаноўка, але і правядзенне майстар-класа па лялькаваджэнню і стварэнні лялькі.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Па шляху спасціжэння сэнсу

Жыццё імклівa бяжыць наперад. Здаецца, толькі ўчора былі студэнтамі, хадзілі на лекцыі, рыхтаваліся да практычных заняткаў, хваляваліся перад залікамі і экзаменамі. Прызнацца, я і сёння вельмі яскрава бачу перад сабою твары сваіх незабыўных настаўнікаў, педагогаў, выкладчыкаў, згадваю іх лектарскае майстэрства. Хоць і прайшоў-сплыў ужо не адзін дзясятак гадоў, з асаблівым піетэтам, пашанотнасцю, павагай згадваю, як дзяліліся з намі сакрэтамі сваёй прафесійнай справы, адкрывалі дасюль неспазнаную намі таямніцу філалагічнай навукі, прывівалі любоў і замілаванне да роднага слова, роднай літаратуры. Сярод тых, хто пакінуў глыбокі след у сэрцы і маёй удзячнай памяці, — Таццяна Іванаўна Шамякіна, мая любімая настаўніца, дарадца, педагог з вялікай літары.

Яна чытала курс тэорыі літаратуры. Акрамя таго, я наведваў і яе спецкурс і спецсемінар, прысвечаныя міфалогіі і псіхалогіі літаратурнай творчасці. На лекцыі хадзілі без прымусу, бо іх слухаць было надзвычай цікава. Аўдыторыя не магла змясціць усіх ахвотных. Як кажуць, яблыку не было дзе ўпасці — студэнты часта сядзелі на падаконніках. Экзамены, праўда, не здаваў, бо Таццяна Іванаўна прапаноўвала творчыя заданні, і калі атрымліваў «выдатна», экзамен залічваўся аўтаматам. Дзякуючы ёй, я змог выступіць на студэнцкай канферэнцыі з дакладам пра асаблівасці міфалагізму ў паэтычнай творчасці Рыгора Барадуліна, а на пятым курсе абараніў на выдатна і дыпломную работу. А яшчэ пазней у часопісе «Роднае слова» была змешчана навуковая публікацыя «“Каб не страціць святое штосьці...”: Нацыянальны космас у творчасці Рыгора Барадуліна». Я ўдзячны Таццяне Шамякінай, што рэкамендавала мяне ў аспірантуру. Кіраваць кандыдацкай дысертацыяй па яе просьбе ўзяўся Алег Антонавіч Лойка, ён жа быў і навуковым кансультантам маёй доктарскай.

Таццяна Іванаўна і ў мае студэнцкія часы, і ў часы аспіранцкія шчодра дзялілася сваімі ведамі, кансультавала, давала парады, забяспечвала адпаведнай літаратурай, якая магла тэарэтычна ўзбагаціць, прывіць навыкі літаратуразнаўчай працы. У кожным выпадку можна было звярнуцца да яе па параду. Бязмежна ўдзячны Таццяне Іванаўне за яе гатоўнасць заўсёды адгукацца на просьбы, за яе вялікі чалавечы талент ісці да людзей з адкрытым сэрцам, дабрынёю, шчырасцю, за ўменне паспагадаць, падтрымаць, сказаць прыязныя словы, абнадзеіць. І так было не толькі ў тыя далёкія студэнцкія і аспіранцкія часы. Так бывае і цяпер, калі дзелішся са сваім дарагім настаўнікам уласнымі жыццёвымі і прафесійнымі клопатамі, перажываннямі, турботамі, а зрэдку — і радасцямі. І неяк падсвядома разумееш: якое гэта вялікае шчасце, калі дзякуючы таму, што ёсць такія духоўна блізкія людзі, адбываецца дыялог пакаленняў, не знікаюць у нікуды нябачныя энергетычныя сувязі, якія падсілкоўваюць, духоўна мацуюць, узбагачаюць, надаюць пэўную жыццёвую стабільнасць, ураўнаважанасць не толькі ўласнаму, але і грамадскаму жыццю. Тады і адчуваеш асаблівую пашану да традыцыі, рэальна пачынаеш усведамляць ролю этычных, маральных каштоўнасцей, цаніць іх носьбітаў і захавальнікаў.

Гэта адносіцца і да Таццяны Іванаўны, якая ў навуковых і публіцыстычных выступленнях шчыра заклапочана станам грамадства, дзе паступова размываецца духоўны стрыжань, назіраецца занядбанне традыцыі, устояў, што суправаджаецца стратай культурнай самабытнасці, яе ўнікальнасці, непаўторнасці. Згодна з яе перакананнем, важна замацаваць у масавай свядомасці канстанты нацыянальнага быцця (фактычна — этнічныя коды), у якіх — ключ для рашэння шмат якіх праблем, паколькі размова ідзе пра тое, што робіць нацыю нацыяй.

Мы ўсё часцей гаворым пра захаванне і паглыбленне гістарычнай памяці, пра зварот да народнага вопыту, да гісторыі. Менавіта погляд назад, засваенне і трансляцыя вопыту пакаленняў выступае надзейным сродкам вызначэння, вывучэння ўласных каранёў, вытокаў жыццядзейнасці, ладу жыцця. Нельга не пагадзіцца з Таццянай Іванаўнай, што толькі праз гісторыю — да ісціны, праз мінулае — да будучыні. Такім бачыцца сённяшні шлях, на якім магчыма ўсведамленне сваёй ідэнтычнасці, самастойнасці і ўнікальнасці гістарычнага шляху.

У свой час я запрасіў яе прыняць удзел у праекце Інстытута філасофіі НАН Беларусі «Нацыянальная культура ў кантэксце сацыякультурных трансфармацый». Праз два гады ён быў паспяхова завершаны. Выйшла аднайменная калектыўная манаграфія. У ёй Таццяны Шамякіна напісала раздзел «Асаблівасці фарміравання і трансфармацыі нацыянальных культурных форм», прысвечаны станаўленню і развіццю міфалагічнай свядомасці, яе ролі ў генезісе чалавечага мыслення. Разам з тым звярнула ўвагу і на змены, выкліканыя новымі тэхналогіямі, і на тое, што прымушае чалавека быць чалавекам, прадстаўніком пэўнай нацыянальнай супольнасці.

У сённяшніх няпростых перыпетыях жыцця важная роля адводзіцца духоўна-інтэлектуальнай эліце, якая заклікана пашыраць гістарычную самасвядомасць грамадства і актуалізаваць анталагічныя і аксіялагічныя знакі ідэнтычнасці, задавальняючы тым самым запатрабаванне грамадства ў саматоеснасці. Перадусім на эліце ляжыць адказнасць за забеспячэнне стабільнасці і наданне ўстойлівасці культурным працэсам шляхам стрымлівання дэструктыўных памкненняў і садзейнічання захаванню традыцыйнага ядра культурнай сістэмы. У сацыяльнай плоскасці яе прысутнасць з’яўляецца ўмовай не толькі развіцця культуры, але і кансалідацыі нацыі, рэсурсам забеспячэння духоўнай бяспекі грамадства. Перадусім творчая эліта адлюстроўвае, персаніфікуе і фарміруе каштоўнасна-нарматыўныя, сэнсаўтваральныя і ідэальна-арыентаваныя складнікі самасвядомасці калектыўных суб’ектаў культуры. Характар цыклаў і этапаў развіцця культуры вызначаецца інтэнсіўнасцю ўплыву духоўна-інтэлектуальнай эліты на культурныя працэсы ў пэўныя культурна-гістарычныя перыяды, у тым ліку і праз фарміраванне своеасаблівай канцэпцыі «памяці нацыі». Прыклад самаадданай і насамрэч дзяржаватворчай чыннасці паказвае сама Таццяна Іванаўна, якая накіроўвае свае высілкі на стабілізацыю і развіццё духоўна-культурных асноў грамадства і захаванне яго нацыякаштоўнаснага стрыжня.

На працягу 1990—2000-х гадоў Таццяна Шамякіна рыхтавала выданні, акрамя падручнікаў па беларускай літаратуры для школы і ВНУ, у асноўным прысвечаныя міфалогіі ў сувязі з фальклорам і літаратурай. Работы шмат у чым арыгінальныя, наватарскія.

Фота Кастуся Дробава.

Таццяна Шамякіна.

Так, у 2010 годзе выйшла кніга «Традиционный китайский календарь и славянские мифологические параллели», за якую атрымала прэмію «Залаты Купідон». Уласна, першапачаткова яна напісала гэтую кнігу па-беларуску, але па заказе Інстытута Канфуцыя ў Беларусі пераклала на рускую мову. Інстытут прыгожа аформіў кнігу і адаслаў амаль увесь яе наклад у Кітай. Я, дарэчы, з’яўляўся навуковым рэцэнзентам гэтай кнігі. Яна складаецца з 12 раздзелаў, аб’яднаных тэмай усходняга народнага календара. Кожны раздзел прысвечаны адпаведнаму жывёльнаму сімвалу і ўяўляе сабой культуралагічнае даследаванне, насычанае багатай, можна сказаць, эксклюзіўнай інфармацыяй. Разглядаецца сувязь славянскай і кітайскай культур, выказваюцца шматлікія цікавыя гіпотэзы, што тычацца міфалагічнай спадчыны славянскіх і ўсходніх народаў, праводзіцца тыпалагічны аналіз, заснаваны на шырокім прыцягненні фактаў з гісторыі літаратуры і мастацтва.

Таццяна Іванаўна актыўна працуе ў напрамку тыпалагічнага вывучэння славянскай і кітайскай культур (міфалогіі, фальклору, літаратуры), рыхтуе шматлікія навуковыя артыкулы, удзельнічае ў навуковых канферэнцыях, нават кіравала напісаннем дысертацый кітайскімі магістрантамі і аспірантамі.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дзе яна працуе, у 2016 годзе выдаў зборнік яе артыкулаў пад назвай «Фальклор і беларуская літаратура ў люстэрку міфалогіі». У кнізе выказваецца шмат цікавых гіпотэз, у новых нечаканых ракурсах разглядаецца творчасць класікаў беларускай літаратуры. Напрыклад, высвятляецца, як міфалагічную свядомасць можна выкарыстоўваць у псіхалагічна-вербальным уздзеянні на чалавека, чым з’яўлялася ў беларускім фальклоры папараць-кветка, як Вацлаў Ластоўскі прадказаў сучасныя нанатэхналогіі і шмат іншае.

Апошнім часам Таццяна Іванаўна заўважна пашырыла дыяпазон даследаванняў. Яе цікавяць пытанні культуры, сацыялогіі, псіхалогіі. Акрамя таго, яна ўсё жыццё цікавілася таямніцамі космасу, Зямлі як планеты, загадкамі прыроды. У 2015 годзе выйшла яе кніга «Парадоксы времени, или Романтика советской науки». Яна звернута як быццам да мінулага — да тых праблем, якімі цікавілася савецкая навука. А на самай справе, адштурхоўваючыся ад дасягненняў савецкай навукі, аўтар гаворыць пра стан масавай свядомасці ў наш час — уздымае тыя пытанні, якімі цікавіцца масавы чытач. Скажам, яна апавядае, як савецкія навуковыя караблі шукалі Атлантыду. Або як Генеральны канструктар касмічнай тэхнікі Сяргей Каралёў пасылаў экспедыцыю шукаць сляды Тунгускага феномена — той незвычайнай падзеі, што здарылася ў Сібіры ў 1908 г. Аўтар гаворыць пра таямніцы мінулага, праецыруючы іх на дзень сённяшні, паглыбляецца ў міфалогію, арыгінальна інтэрпрэтуе літаратурныя творы. Талент Таццяны Іванаўны скіраваны на стварэнне твораў эсэістычнага плана, не без удзелу і публіцыстыкі, часам вельмі востра. Пра гэта сведчыць нядаўняя кніга «Природа — Социум — Словесность» (2023), якая дэманструе ўвесь шырокі дыяпазон яе інтарэсаў, фенаменальную культуралагічную, літаратурную эрудыцыю.

Таццяна Шамякіна — адзін з найлепшых даследчыкаў творчасці народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна. Штогод публікуе шэраг артыкулаў, прысвечаных творчасці бацькі. У 2011 годзе выйшла кніга «Іван Шамякін. Вядомы і невядомы», другое перавыданне якой здзейснілася у 2021 г., да 100-годдзя пісьменніка.

У некаторых сваіх працах успамінае пра шмат якіх пісьменнікаў — і беларускіх, і з іншых краін. Невыпадкова, што менавіта яна, якая цудоўна ведала розных творцаў, распрацавала арыгінальную дысцыпліну «Псіхалогія літаратурнай творчасці» і шмат гадоў чытае як студэнтам. У 2021 годзе да 100-годдзя БДУ ўніверсітэт выдаў яе вучэбны дапаможнік па гэтай дысцыпліне. Кніга — унікальная, па сутнасці, першая і адзіная ў краіне прысвечана маладаследаванай праблематыцы і ўяўляе сабой надзвычай глыбокае даследаванне.

Мы ўсё часцей гаворым пра захаванне і паглыбленне гістарычнай памяці, пра зварот да народнага вопыту, да гісторыі. Менавіта погляд назад, засваенне і трансляцыя вопыту пакаленняў выступае надзейным сродкам вызначэння, вывучэння ўласных каранёў, вытокаў жыццядзейнасці, ладу жыцця. Нельга не пагадзіцца з Таццянай Іванаўнай, што толькі праз гісторыю — да ісціны, праз мінулае — да будучыні. Такім бачыцца сённяшні шлях, на якім магчыма ўсведамленне сваёй ідэнтычнасці, самастойнасці і ўнікальнасці гістарычнага шляху.

Таццяна Іванаўна і сёння застаецца нязменна на перадавой, у гушчы падзей, займаецца выкладчыцкай і навуковай дзейнасцю, актыўна друкуецца, прапануе свае аналітычныя артыкулы, шукае і знаходзіць розныя спосабы і шляхі, каб дастукацца да чалавечых сэрцаў і розуму. Навуковы і чалавечы досвед выдатнага вучонага, таленавітага педагога наўздзіў запатрабаваны: ён дапамагае маладому пакаленню сфарміраваць уяўленні пра маральна-этычны імператыў, змадэляваць жыццёвую стратэгію асобаснай і грамадскай самасвядомасці, развіць здольнасць да эстэтычнага ўспрымання жыцця. Няхай жа майго дарагога Настаўніка чакаюць наперадзе толькі шчаслівыя моманты адкрыцця новага, спасціжэння дасюль неспазнанага, загадкавага, таямнічага, каб і надалей на ўсю моц па-новаму адчуваць асалоду судакранання з прыгожым, культываваць культурна-гістарычную і літаратурную традыцыю, спрыяць спасціжэнню яе каштоўнасцей і сэнсаў.

Валерый МАКСІМОВІЧ

Думкі пра пошук парадыгмы

Развіццё кожнай навукі адпавядае пэўнай заканамернасці. Спачатку ідзе збіранне, назапашванне фактаў, у тым ліку фактаў духоўнага парадку, затым іх асэнсаванне, нарэшце вывядзенне на гэтай аснове тэорый — абагульненняў з мэтай таксама і практычнага выкарыстання. І хоць у мастацкай літаратуры і ў фальклоры кожны факт (твор) мае самастойнае значэнне і патрабуе асобнага вывучэння і інтэрпрэтацыі, але і гуманітарная навука развіваецца па згаданай схеме.

Возьмем фальклярыстыку. Менш чым за два стагоддзі яна ў Беларусі прайшла вялікі і слаўны шлях. Першы этап гэтага шляху — апісальны, збор тэкстаў. Фальклор беларусаў аказаўся выключна багаты. Яшчэ ў савецкі час пачалося яго сістэматызаванае выданне. Дзякуючы каласальнай працы навукоўцаў пабачылі свет зборнікі з цыкла «Беларуская народная культура». Пачалося ўнікальнае выданне ў 1970 годзе, а цяпер кніг ужо 52. Выходзілі і іншыя тэматычныя зборнікі, шматлікія манаграфіі навукоўцаў. У 2006 годзе выдадзена энцыклапедыя ў двух тамах «Беларускі фальклор». Цэлая плеяда фальклярыстаў сабрала, падагуліла велізарную колькасць матэрыялу, класіфікавала яго — перш за ўсё па жанрах.



У канцы XX стагоддзя новыя тэмы дыпломных работ, дысертацый, манаграфій засведчылі, што апісальны перыяд фактычна закончыўся, фальклярыстыка ўступіла ў якасна новы этап. Пры вывучэнні фальклору даследчыкі пачалі звяртацца да тэорыі літаратуры, да семіётыкі, структуралізму, міфалогіі. Ды і сама міфалогія *як навука* ў 1990-я гады так імкліва развівалася таму, што асноўвалася на фальклорным матэрыяле. Навукі ўзаемна ўзбагачаліся.

Мы рэдка задумваемся пра тое, як змянілася *бытавая культура* народа пад уплывам глыбокага вывучэння фальклору, калі разумець пад гэтым паняццем і вербальны фальклор, і яго матэрыяльную частку (тое, што лічыцца этнаграфіяй). Скажам, у 1960-я гады вясельныя рытуалы ў горадзе праходзілі бедна, хоць і весела. Маладыя сядзелі на кажухах, не ведаючы, што гэта азначае, а родзічы абсыпалі іх зернем. Але насычэнне свят прыгожай народнай абраднасцю праходзіла імкліва.

У 1980-я гады студэнты з майго вучэбнага семінара ўпершыню пачалі калядаваць — напачатку ў так званым «пісьменніцкім доме» па вуліцы Маркса, 36. Жыхары былі папярэджаны, гэтым мы забяспечылі поспех акцыі. Студэнты падрыхтаваліся ў найлепшых традыцыях народных свят. Мелі поспех. У выніку яны, згінаючыся, ледзь прыцягнулі ў інтэрнат цяжкія мяхі з прысмакамі — насельнікі цэлага паверха харчаваліся тры дні. У тыя ж гады летам пачалося святкаванне Купалля — спачатку ў Заслаўі.

Не ўсё тады атрымалася. Так, мы зразумелі, што калядаванне ў горадзе, у незнаёмых дамах, немагчыма. Але важна, што імпульс быў дадзены. Усё больш смела традыцыйныя элементы пачалі выкарыстоўвацца ў абрадах, узнікалі ансамблі народнай музыкі, значна ўзбагаціліся інтэр'еры самых розных тыпаў памяшканняў, на гэтай аснове афармляліся аграэкасядзібы, што пачалі прыносіць значны даход гаспадарам і дзяржаве.

Што ж тычыцца навукі фальклярыстыкі, то, значна абнавіўшыся на мяжы стагоддзяў, сёння яна шукае новыя шляхі. Расце грамадская запатрабаванасць у больш глыбокім асэнсаванні народнай спадчыны.

Варта грунтоўна даследаваць паэтыку твораў, іх сувязь з этнаграфіяй, гісторыяй, культуралогіяй, мовазнаўствам. Нейкія даследаванні, безумоўна, вядуцца, абараняюцца дысертацыі, але яны — заслуга даследчыкаў сярэдняга пакалення, якія ў гады маладосці пазначылі сваімі працамі новую парадыгму. А сёння проста не хапае сіл. За сярэднім пакаленнем не стаіць маладая змена. Ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў ліквідавалі кафедру фальклору (!). Нонсэнс. Гэта цяжка нават усвядоміць. Але радуе тое, што ў БДУ даследуецца гарадскі фальклор. Тэма важная, бо выводзіць, па сутнасці, на сацыялагічную праблематыку, на тыя складнікі самасвядомасці нацыі, якія неабходна ўлічваць у сваёй дзейнасці і палітыкам, і журналістам, і гаспадарнікам. Аднак у фальклярыстычнай навуцы гэта, уласна кажучы, новае кола таго ж апісальніцтва, праўда, з адначасовым асэнсаваннем матэрыялу.

Між тым неабходны прарыў, прычым шырокафрантальны і на новай парадыгме. Ён магчымы толькі з захопам у полі зроку дадзенай навукі дасягненняў іншых навук, інакш кажучы, зыходзячы з *тэорыі адзінства*. Кожны вобраз, кожны міф, кожны фальклорны сюжэт патрабуе падрабязнага тлумачэння з улікам самых розных ведаў, няхай гэта пакуль будуць гіпотэзы, версіі. Напрыклад, ужо вельмі даўно я выказала думку, што папараць-кветка — гэта сонца *надзіра*, так званае — у міфалогіі — «чорнае сонца», падземнае, якое толькі раз на год — на Купалле — выходзіць на паверхню зямлі. Гэта тлумачэнне погляду на з'яву нашых продкаў. Задача ж навукі — зразумець, як узнікла ўяўленне пра «чорнае сонца», з якімі астранамічнымі ведамі яно было звязана, чаму на зямлі набыло выгляд кветкі, чаму кветка аказалася надзеленай незвычайнымі чароўнымі ўласцівасцямі, чаму ў фальклоры няма твораў, дзе папараць-кветка, нават калі яе і знайшлі, ажыццяўляла б свае магічныя функцыі, бо акружана сонмам нячысцікаў. Цэлы комплекс пытанняў, адказы на якія патрабуюць значнай работы *фантазіі*. А фантазіі якраз не хапае, бо не хапае ведаў. Скажам, ведаў па міфалогіі. Магутны ўздым цікавасці да міфалогіі ў 1990-я гады хутка сышоў. Міфалогія — гэта не толькі вобразы Бабы Ягі і лесавіка, як наіўна лічаць, а прынцыпы дзеяння нашай свядомасці, псіхалагічныя законы, якім падпарадкоўваецца і асобны чалавек, і народ.

У свой час вядомы філолаг Дзмітрый Ліхачоў выказаў думку, што ў XXI ст. адбудзецца *расшыфроўка міфаў*, і лічыў гэта найважнейшым дасягненнем у гуманітарнай навуцы. Каб яно адбылося, неабходна і звяртанне да этымалогіі, навукі, якая ў нас прыйшла ў поўны заняпад. Карацей кажучы, фальклярыстыка павінна зрабіцца *інтэгральнай навукай*. Уласна, гэта патрабуецца і іншым навукам. Без *сінтэзу* далейшае развіццё немагчыма. Інакш не выйсці з *сістэмнага крызісу*, у якім знаходзіцца сучасная культура ва ўсім свеце. Таму і адукацыя павінна будавацца на іншых прынцыпах.

Дазволю сабе нагадаць, што слова «ўніверсітэт» у перакладзе з лацінскай мовы азначае «сукупнасць». Маецца на ўвазе набыццё такой сукупнасці ведаў, якая б не толькі навучала, але і *адукоўвала* студэнтаў, рабіла б з іх людзей з шырокім кругаглядам, якія мысляць дыялектычна і гістарычна, разумеюць сутнасць з'яў. Усе, у тым ліку чыноўнікі ад адукацыі, гэта усведамляюць, пастаянна пафасна гавораць, а ў рэальнасці дысцыпліны, якія прызваны пашыраць кругагляд студэнтаў, развіваць іх інтэлектуальна, а не механічна-прагматычна, ліквідуюцца. Але ўжо сёння відаць, што прарыву такое навучанне не толькі ў тэорыі, але і ў практыцы не дае. Пакуль усё трымаецца на старэйшым і сярэднім пакаленнях. У *гуманітарных навуках* маладыя, якія, безумоўна, шмат робяць пад кіраўніцтвам старэйшых, выказваць крэатыўныя ідэі неяк саромеюцца…

Культура разнесена па асобных сусеках і таму не працуе як *цэлае* ва ўмовах, калі ўсё ў свеце імкнецца да сувязі. Адукацыя ва ўніверсітэце павінна ахопліваць не толькі навукі, але і культуру ў цэлым. Разам з выхаваннем. Але сама культура — сапраўдная культура, народная і класічная, — якраз і выхоўвае. Патрыятычнае выхаванне моладзі — не толькі шэраг пэўных мерапрыемстваў (безумоўна, патрэбных), але і далучэнне да ўласнай культуры. Дарэчы, і да сусветнай таксама, але менавіта культуры, а не да сучасных тэхналогій, якія хутка адыходзяць і далучэнне да якіх моладзь лічыць прагрэсам. Тэхналогіі — гэта толькі форма, праз якую можна перадаваць розныя зместы. Якія будуць зместы — стваральныя або дэструктыўныя, — залежыць ад таго, у якім культурным асяродку выхоўваюцца тыя, хто новымі тэхналогіямі валодаюць.

Не толькі навукоўцам неабходны прарыў, але і ўсяму насельніцтву варта больш шырока і глыбока (не на ўзроўні сувенірна-турыстычным) звяртацца да сваіх каранёў, задумацца пра ўласную ідэнтычнасць. Ёсць краіны, якія ставяцца да нас варожа, значыць, неабходна больш асцярожна (мякка кажучы) ужываць іх мову, якою напоўнена маўленне моладзі, тэксты журналістаў і чыноўнікаў, шыльды на вуліцах гарадоў. А пачаць прапаную са змянення назвы конкурсу «Міс Беларусь». Чаму дзяўчаты-беларускі — «міс»?! І чаму шараговы зварот «міс» — гэта нешта ганаровае? Смешна і недарэчна! У адным з беларускіх рэгіёнаў мясцовы конкурс называўся «Краса…» Вось выдатная знаходка: «Краса Беларусі», «Краса Мінска» і інш. Па-славянску прыгожа і больш адпавядае сутнасці. Акрамя таго, шакіруе, калі журналісты называюць ранейшую міс «самай прыгожай дзяўчынай Беларусі». Гэта, на маю думку, нетактоўна ў адносінах да іншых дзяўчат нашай краіны. Мне за іх крыўдна. Я працую з моладдзю пяцьдзясят гадоў і не бачыла непрыгожых дзяўчат. *Усе прыгожыя, але па-свойму*. Неабходна іх прыгажосць *убачыць* (не на пошлых, скажам шчыра, шоу). Для гэтага, зноў-такі, неабходны пэўны ўзровень культуры, які дасягаецца разуменнем такога жанру жывапісу, як партрэт, знаёмствам з шэдэўрамі кінамастацтва і г. д.

Нейкае іншае, больш глыбокае напаўненне неабходна ўносіць сёння ў паняцце «прыгажосць».

Фота з сайта tribunapracy.by

Купалле.

Фота БелТА.

Калядоўшчыкі.

Традыцыя правядзення конкурсаў прыгажосці ўсталявалася ў 1988 годзе, калі пэўныя грамадскія структуры, унутраныя і міжнародныя, рыхтавалі СССР да перамены ў грамадскім ладзе. Усё на продаж! У тым ліку прыгажосць, як быццам яе можна вымяраць па нейкіх параметрах і параўноўваць прыгожыя з'явы паміж сабою! Насельніцтва да шмат чаго, зусім недарэчнага, прывучылі. Але часы змяніліся — прыйшла пара адыходзіць ад звыклых з *кашмарных часоў перабудовы* стэрэатыпаў.

Ёсць яшчэ адзін аспект праблемы. Мы ўсе заклапочаны ўмацаваннем беларускакй сям'і. Аснова сям'і — каханне. І для любога хлопца самая прыгожая дзяўчына ў свеце — яго каханая. Не патрэбна ўвагу будучых жаніхоў адцягваць дэманстрацыяй шаблонаў-ідэалаў. Розныя «міс» з іх галівудскімі параметрамі — не ідэалы. А толькі выбранніца — адна-адзіная і непаўторная.

Я б зрабіла так (выказваю ідэю). Падлічыла б колькасць дзяўчат, якім у 2024 годзе спаўняецца 20 гадоў. Раздзяліла б іх агульную колькасць на 365 дзён. Напрыклад, атрымалася б па 10 чалавек на дзень. Кожны дзень або ў асобнай перадачы, або паміж перадачамі па дзве хвіліны паказвала б ролік пра прызначаных на гэты дзень дзяўчат. Тады кожная задумалася б, у якім абліччы паўстаць, на якім фоне, што распавесці пра свае інтарэсы, сваё хобі. Вось бы і атрымалася поўная панарама маладой беларускай прыгажосці. І так кожны год. З часам выхаваўчы патэнцыял гэтай акцыі ўзрастаў бы… Народ павінен убачыць *усіх сваіх прыгажунь*!

Таццяна ШАМЯКІНА,
доктар філалагічных навук,
прафесар, член СП Беларусі

Зухра БУРАКАЕВА

Змей

Апавяданне

Стары Саліх’ян перавярнуў скрыню для квактух, стаў на яе і абняў скамянелае цела сына. Ільгам павесіўся на сваім рэмені. Не жадаючы ўсведамляць, якое звалілася на яго новае гора або імкнучыся не выліць апошнія кроплі спакою, Саліх’ян быў надзвычай акуратны ў кожным жэсце, у кожным кроку. Гавораць, што мёртвае цела бывае цяжкім, але стары не адчуў гэтага. Ён абрэзаў рэмень нажом для мяса, узваліў на сябе Ільгама і выцягнуў вонкі. Меркаваў пакласці цела на старую лаву, прыстасаваную для розных гаспадарчых спраў, але пашкадаваў сына: вырашыў аднесці яго ў сад, у альтанку, дзе яны любілі піць гарбату цёплымі летнімі вечарамі.

Брамка ў сад расхінулася ад парыву ветру і стукнула па левай назе Ільгама. Стары Саліх’ян паклаў сына на лаву, сам прысеў побач. Кветкі, што пасадзіла яго старая Ільсіяр, скурчыліся і счарнелі. Трэба было б нешта з іх выкапаць і выкінуць, а сякія-такія карані занесці дадому на зіму. Стары Саліх’ян сціснуў пальцы правай рукі ў кулак і зноў расціснуў іх. Апошнім часам ён часта так рабіў — правая рука моцна балела.

Вецер усё шалеў: сарваў ахапак павою і кінуў на твар Ільгама. Стары Саліх’ян устаў, наматаў сухія сцёблы на руку. Пайшоў выкідваць іх у вогнішча. Калі ішоў назад, падабраў чаравік, што ўпаў з левай нагі Ільгама. Паспрабаваў надзець яго на нагу сына. Але нага застыла як качарга, і чаравік не лез на яе.

Стары Саліх’ян кінуў чаравік убок, закрыў твар рукамі і заплакаў.

* * *

«Маці…» Ільсіяр не адказала. Пасля жахлівай ночы ў трызненні яна забылася цяжкім сном. Стары Саліх’ян паклаў руку ёй на лоб. «Белы вядзьмак павінен ведаць», — сказала старая Ільсіяр, расплюшчыўшы вочы. Саліх’ян прамаўчаў. «Змеі, — сказала яна. — Гэта ўсё змеі…» Зноў заплюшчыла вочы. Лоб яе пакрыўся потам, і яна пачала шаптаць малітву на нейкай дзіўнай — ці то забытай, ці то прыдуманай — мове. Стары Саліх’ян нават узрадаваўся, што яна зноў пачала трызніць. Цяпер ён не жадаў ёй лепшай долі, чым сысці ў іншы свет, не ведаючы, што яе любы малодшы сын павесіўся. Але тут Ільсіяр рэзка прыўзнялася і шырока расплюшчыла блакітныя вочы. «Дзе Ільгам?» — спытала яна. Саліх’ян адвярнуўся. Было невыносна трываць агонь яе позірку, і стары ўстаў. «Халодна... Дровы...» — сказаў ён знарок гучна.

На вуліцы было цёмна. Саліх’ян, стараючыся не глядзець на цела, накрытае старой коўдрай, накіраваўся ў бок дроўніка. На зваротным шляху рэзка заныла правая рука. Бярэмя дроў упала старому на ногі. «Няхай, няхай мне будзе балюча», — са злосцю падумаў стары. Калі ўжо не вярнуць сына, трэба хаця б зберагчы сваю старую, з якой пражылі душа ў душу сорак гадоў. А ён нават слёз не можа стрымаць.

Ён падбіраў дровы левай рукой, заносіў у хату па адным-два палене. Падпаліў у печы. Ільсіяр спала і трызніла ў сне.

* * *

Белы вядзьмак біў у дунгур[1] спачатку павольна, затым усё хутчэй і хутчэй. З кожным ударам дунгура вогнішча разгаралася, а неўзабаве ператварылася ў вялізны сноп іскраў. Вядзьмак выкрыкваў незразумелыя словы, пасля чаго ўшчыльную наблізіўся да Ільсіяр і пачаў нешта паспешліва шаптаць ёй на вуха. Вочы яго закаціліся.

У агні з’явіўся бледны Ільгам. Было заўважна, як у яго празрыстым целе шалеў, круціўся ў танцы чорны змей. Стары сунуў руку ўнутр цела і паспрабаваў выцягнуць змея. Але толькі схапіў яго, як Ільгам знік. Вядзьмак забрынькаў бранзалетам з воўчых іклаў і раптам рэзка замоўк. Потым насцярожана пачаў услухоўвацца ў цемру і, нібы адказваючы камусьці, заспяваў, не, амаль завыў узляў[2]. Рэзка змоўк. І зноў пачаў стукаць у дунгур.

Цяпер ён нешта крычаў на роднай мове. У Ільсіяр нават галава загула — так яна намагалася пачуць словы, якімі скаланаў паветра Белы вядзьмак:

Джала, джала, джала змея,
Джала вострае ў змея,
Хуткі ты, нібы страла,
Вёрткі ты, нібы вада...

* * *

«…хочаш выйсці — выходзь,
А не хочаш, дык замры,
Абярніся ж у камень, змей...

Старажытныя башкіры загаворам лячылі не толькі змяіны ўкус, але і розныя хваробы, якія прыносіла чорная сіла, якую назвалі Ук. Некаторыя заклінальнікі змей былі настолькі моцныя, што паўзуны пляліся за імі следам, расцягваліся, набракалі і ўрэшце паміралі.

Загаворы трымаліся ў строгім сакрэце. Гэты сакрэт не маглі ведаць нават самыя блізкія людзі заклінальніка. І таму абрады, звязаныя з замовай змей, практычна не захаваліся — не толькі ў башкіраў, але і ў іншых народаў».

Лілія адклала ўбок запісы мужа, зноў заварыла сабе моцную гарбату. На вуліцы — золкая асенняя ноч. Ёй і мужу Загіру падабаліся такія ночы. Пасля насычаных летніх экспедыцый, падчас якіх збіраўся добры матэрыял, у такія тужлівыя асеннія ночы яны сядзелі на кухні, пісалі свае навуковыя артыкулы пад буркатанне імбрычка, які закіпаў. Вось гарбата гатова. Яны перакусвалі блінчыкамі ці кавалкамі пірага, што засталіся ад вячэры, ціха размаўлялі, смяяліся. А потым зноў садзіліся за работу. Божа, якія ж яны былі шчаслівыя тады... Лілія зразумела гэта пасля таго, як тры гады таму муж стаў моцна піць, а летась павесіўся.

«Мама!» Ад немага крыку жанчына ледзь не выпусціла кубак. Лілія пабегла ў пакой, дзе спаў сын. Яміль накрыўся коўдрай з галавой і дрыжаў. «Сынок, гэта я... Што з табой, мой харошы?» У апошнія гады нервы моцна здалі не толькі ў яе, але і ў сямігадовага сыночка. Ён часта прачынаўся па начах, заліты слязьмі: «Майго бацьку пажырае страшны Аждаха[3]!» А вечарамі доўга не мог заснуць і ўсё паўтараў: «Я баюся сноў. Я не хачу бачыць сны». Трэба было б недзе падлячыць яго перад школай — ды грошай не знайшлося. Дзядуля з бабуляй усё клічуць пагасціць у вёску, але пасля смерці Загіра Лілія проста баіцца зірнуць у вочы свякрусе і свёкру. Перад гэтым павесіўся брат Загіра, не прайшло і двух гадоў — пайшоў Загір. Пасля смерці двух сыноў у вачах бацькі і маці жыў безвыходны смутак.

* * *

Белы вядзьмак яшчэ раз гучна працягнуў узляу і змоўк. Змоўк надоўга. Затым уважліва паглядзеў сваімі зялёнымі вачыма на Ільсіяр. У вачах быў жаль. «Не адбірай надзею», — прашаптала яна. Вядзьмак апусціў галаву. У грудзях Ільсіяр са страшным болем нацягнулася, зазвінела нейкая жыла. Цярпець гэты боль было немагчыма. Бабулька сціснула рукамі грудзі... «Трэці сын...»

«Паплач, паплач», — нехта беражліва паляпаў яе па спіне, але ж і для слёз патрэбны сілы…

* * *

Стары Саліх’ян пяшчотна паляпаў жонку па спіне. Прынёс вады, ледзь не сілком уліў у рот, вільготным ручніком выцер яе потны твар. Ільсіяр з цяжкасцю расплюшчыла вочы, сціснула руку мужа і вымавіла: «Ільгам таксама пакінуў нас». Вось ужо тры гадзіны Саліх’ян толькі і хацеў, каб жонка пайшла з жыцця, не ведаючы пра смерць трэцяга сына, а цяпер яму заставалася адно кіўнуць у адказ. Замоўклі. Мінула шмат часу, і старая прашаптала: «Адно жаданне: як памру, ты сыходзь за мной следам». Саліх’ян яшчэ раз моўчкі кіўнуў.

* * *

«…Дзядзька Ільгам абняў мяне, а сам такі гарачы — вельмі гарачы… Я задыхаюся, а ён мяне не адпускае…» Лілія падняла сына, выйшла на кухню, наліла ў гарбату кропель, але Яміль усё не супакойваўся. «Проста дзядзька Ільгам засумаваў па табе. Мы ж і ўлетку не змаглі да іх паехаць. Заўтра ж напішы яму ліст, добра? Напішы, што прыедзеш да іх на зімовыя канікулы, што вы будзеце катацца на лыжах, на санках…» Ці то падзейнічалі лекі, ці то супакоіў ціхі голас маці — галава хлапчука схілілася на яе плячо. Лілія аднесла яго назад, сама таксама прылегла на канапу ў надзеі заснуць, але жудасная трывога не адпускала яе. Жанчына зноў выйшла на кухню і стала разбіраць запісы мужа.

Яны скончылі з Загірам геафак. Хоць і вучыліся ў адзін час, блізка пазнаёміліся падчас вучобы ў аспірантуры. Ажаніліся адразу пасля абароны сваіх дысертацый. Іх абаіх хацелі пакінуць выкладаць ва ўніверсітэце, але маладыя цвёрда вырашылі цалкам прысвяціць сябе навуцы. Вядома, заробак у навуковых работнікаў мізэрны. Таму Загір з сябрамі займаўся еўрарамонтам, працаваў па начах ахоўнікам. Лілія сядзела дома з дзіцем, але і яна зарабляла грошы — друкавала на машынцы. У экспедыцыі яны выязджалі практычна за свае грошы. Такая адданасць навуцы прынесла свой плён — яны выйгралі грант. Урэшце была магчымасць сур’ёзна займацца толькі сваёй тэмай. Але падчас адной з паездак Загір разгаварыўся са стогадовай старой і раптам рэзка вырашыў памяняць напрамак дзейнасці. Ён захапіўся рознымі павер’ямі, замовамі і заклінаннямі, паглыбіўся ў вывучэнне фальклору. Усе былі проста ўражаны такім паваротам, бо ў маладога вучонага ўжо назапасіўся матэрыял для доктарскай дысертацыі па геалогіі.

Лілія даўно хацела пазбавіцца ад апошніх запісаў свайго мужа. З навуковага пункту гледжання яны не ўяўлялі ніякай каштоўнасці. А захоўваць іх як памяць — якая ўжо тут памяць... У гэтых паперах нібы захоўвалася нейкая злая сіла. Некаторыя запісы былі зусім бессэнсоўныя, відаць, напісаны ў стане ап’янення — яны і палохалі Лілію.

«Ведаю па сабе — гэтая чорная сіла пачынае перш за ўсё пажыраць унутранае вока. Тое вока, што здольна бачыць прыгажосць і адухоўленасць існага… Мяне нешта грызе знутры — нясцерпна…»

«Галоўная мэта Аждахі — знішчыць тых людзей, якія імкнуцца спасцігнуць сутнасць быцця... Што зрабіць?..»

«Як пазбавіцца ад гэтай нуды? Яе можа крыху загасіць гарэлка… НЕ! НЕ МОЖА!»

Лілія чытае іх, і кожны раз усярэдзіне яе ўсё халаднее. Але чамусьці выкінуць іх рука не падымаецца. Яна зноў паставіла імбрычык на пліту і стала глядзець у акно, у якое адчайна хвастаў халодны восеньскі дождж. Не было ні пачуццяў, ні думак. Здаецца, світала — неба набыло шараватае адценне.

* * *

Ільсіяр памерла раніцай. І ў той момант раптам перастала імжэць. Стары Саліх’ян стаяў тым часам каля будынка сельскай адміністрацыі. Ён глядзеў на блакітную палоску неба, якая з’явілася на імгненне паміж дзвюма цяжкімі шэрымі хмарамі, і моўчкі развітваўся са сваёй старой. «Душа яе трапіла на нябёсы», — падумаў ён, і стала крыху лягчэй. Ён зноў зайшоў у адміністрацыю. «Вось і Ільсіяр пакінула нас», — сказаў ён. Усе, хто быў там, пераглянуліся — толькі што стары ўзяў грошы на пахаванне сына. «Мы пахаваем іх разам», — сказаў Саліх’ян і хуткім крокам рушыў дахаты. «Здаецца, стары крануўся розумам», — сказала прыбіральшчыца, выціраючы хусткай вочы.

* * *

Ільсіяр было цяжка прадзірацца скрозь дымную заслону, але неўзабаве ёй здалося, што паветра само падштурхоўвае. А калі дайшла да звінячага, нібы крышталь, блакітнага неба, ужо нічога не адчувалася. Асляпляльны блакіт і ціхі звон — суцяшальны, міратворны крыштальны звон...

Дзе яна магла бачыць гэтыя ясныя сінія вочы? Золатавалосая дзяўчына ў белым адзенні жэстам паклікала яе. Усміхнулася сумна, але вельмі ласкава. «Сядай, інэй[4], адпачні крыху», — сказала яна і паказала белым крылом на месца побач. На што яна села — незразумела, усё было ахутана ружаватым туманам. Дзяўчына маўчала, схіліўшы галаву. Затым цяжка ўздыхнула і неахвотна пачала:

— Хутка ты знойдзеш заспакаенне сваёй душы… Хутка ты забудзешся пра ўсё…

— Сыны там?

Дзяўчына схіліла галаву і паківала. У паветры пачуўся ледзь улоўны звон. Часам вецер рассейваў туман і адкрываў асляпляльны блакіт.

— Ён здабыў новую сілу, — сказала дзяўчына і адкінула галаву назад, спрабуючы схаваць слёзы. Але адна слязінка выкацілася і павольна папаўзла па яе белым твары.

— Хто ён?

— Аждаха… У былыя часы ён не мог нас перамагчы, але вось — знайшоў іншы шлях. Ён ператварыўся ў вялікае мноства змей. Змеі пранікаюць у чалавека і пачынаюць грызці яго душу… Чалавека ахоплівае тагасветная туга, ён страчвае сэнс жыцця…

— Мае сыны?.. Дзе яны?..

Дзяўчына паказала крылом уніз:

— Пераможаныя Аждахам застаюцца ў зямлі.

Яна закрыла твар крыламі і надоўга змоўкла.

— А вы... Хіба вы не маглі дапамагчы?

— Цяпер людзі самі пішуць свой лёс, — сумна адказала дзяўчына.

Ружовая смуга амаль рассеялася. Блакітнасць загусцела, стала адліваць фіялетавым.

— У мяне там застаўся ўнук Яміль…

— Цяпер ты нічога не зможаш зрабіць.

— А я магу прыйсці да яго ў сне і расказаць пра змея?

Дзяўчына ўважліва паглядзела на яе сінімі вачыма і сказала:

— Калі не вернешся праз сорак дзён, ніколі ўжо не вернешся сюды.

Ляцець назад было нашмат лягчэй. І калі цяжар паветра пераняў дыханне, насцярожыла плясканне крылаў. Цяпер і ў яе ёсць крылы?! Дык хто ж яна?

Яна прызямлілася каля лужыны і паспяшалася зірнуць на сябе. І ўбачыла ў адлюстраванні белую галубку.

* * *

Стары Саліх'ян узяў са стала высахлы кавалак хлеба, разламаў яго і вынес крошкі белай галубцы, што буркавала каля акна. Галубка бераżліва падабрала кожную дробку. «Расказвай, старая, добра там?» Галубка кіўнула галавой. «А я не буду спяшацца. Нявестка наша, Лілія, паклікала жыць да сябе. Трэба паставіць на ногі Яміля…»

Галубка заставалася каля старога некалькі дзён. А аднойчы раніцай стары не пачуў яе далікатнага буркавання. Саліх'ян бераżліва разгладзіў белае пёрка, якое ляжала на стале, паклаў у нагрудную кішэню і пачаў збірацца ў горад.

* * *

Змей, прызначаны для Яміля, не мітусіўся. У ім жыла пачварнасць, загартаваная тысячагоддзямі. Ён будзе чакаць месяц, год — але сваю справу зробіць як мае быць.

Яміль саскочыў з ровара і пачаў назіраць за мурашнікам. Ён забыўся пра ўсё на свеце. Вось так падоўгу ён назірае за мурашкамі, а дома спрабуе намаляваць усё на паперы.

Змей выпаўз з-пад дрэва і пачаў падкрадацца да хлапчука. Можа, сёння яму пашанцуе поспех? Ён поўз вельмі асцярожна. Пры самай нязначнай небяспецы застываў галінкай ці хаваўся пад лісцікам. Вось яго ахвяра — засталося толькі скокнуць і стралой упіцца яму ў шыю... Вось зараз, зараз... Лягчэй трапіць у чалавека, пакуль ён яшчэ маленькі, а вось стане джыгітам — і грызі душу ўволю!..

Але ў гэты момант нешта балюча ўкалола яго. Што гэта было, што? Змей пачаў задыхацца, адбівацца ад небяспекі хвастом.

Белая галубка моцна ўпілася ў змея сваімі кіпцюркамі, але сіл у яе было няшмат. Дык дзе ж у гэтага гада сэрца?

Смярдзючая кроў закрыла ўсё горла, заліла вочы, але галубка ўядалася дзюбай усё далей. Абы не задыхнуцца — але дзе, дзе сэрца?!

Вось яно, вось. Галубка дзюбай дацягнулася да нечага брыдкага, трапяткога. Яшчэ. Яшчэ. Яна залезла ў дрыготкі камяк усёй галавой. Змей выгнуўся з перадсмяротным гучным шыпеннем, закруціўся, стаў чорнай жыжкай, якая пайшла ў зямлю.

* * *

— Мама, а чаму паміраюць птушкі?

— Не ведаю, сынок. Пойдзем хутчэй, сынок, у шэсць гадзін прыязджае дзядуля...

Яміль вызваліў руку з рукі маці і зноў пабег да мёртвай галубкі.

— Яміль, мы спазняемся!

Хлопчык працягнуў руку, узяў белае пёрка, якое зляцела з правага крыла, асцярожна паклаў яго ў нагрудную кішэню і пабег назад да маці.

Пераклад з рускай Алены СТЭЛЬМАХ

---

[1] Дунгур — ударны інструмент, выраблены з нацягнутай цялячай скуры.

[2] Узляў — гарлавыя спевы ў башкіраў.

[3] Аждаха — міфічная істота, увасабленне зла ў башкірскім фальклоры.

[4] Інэй — паважлівы зварот да жанчын, старэйшых за сябе.

Айгіз БАЙМУХАМЕТАЎ

Мара

Апавяданне

Плач... Чыйсьці няўцешны плач пачуўся зусім побач, з суседняга пакоя! Сэрца сціснулася і замерла. Што магло здарыцца? Мы імгненна сарваліся з месца і гуртам убеглі ў пакой.

На краі ложка, абняўшы кволымі ручкамі каленкі і нізка апусціўшы галаву, сядзеў Рустам. У дзіцячым доме ён жыве толькі другі год. Вучыцца ў пятым класе. У яго выразных карых вачах заўсёды адлюстроўваецца нейкая неверагодная туга... Я ні разу не бачыў яго ўсмешкі!

— Рустам, што здарылася? Чаму ты плачаш? — мы навыперадкі стараліся неяк супакоіць хлопчыка.

— Ну! Можа, нехта ўдарыў цябе?

Рустам гучна ўсхліпваў, кволае цела скалыналася ад глыбокага плачу, які давёў яго да знямогі, але спыніцца ён ніяк не мог.

— Хто цябе пабіў? Скажы мне, зараз я яму самому па баках надаю! — старэйшы хлопчык дастаў з кішэні цукерку і працягнуў яе Рустаму. Але той быў няўцешны.

У гэты момант дзверы шырока расчыніліся і ў пакой уварвалася наша выхавальніца Райфа апа:

— Што за шум! Я што, вартаваць вас павінна? Ні на хвіліну немагчыма адлучыцца — гатовы пазабіваць адзін аднаго! У мяне што, хатніх спраў няма? Вунь, каровы гарлапаняць у тры глоткі! Свае дзеці самі па сабе, пакуль я тут чужых выхоўваю!

Выхавальніца ледзь стрымлівалася, каб не надаваць нам усім сваімі ручышчамі па шчоках, у яе поглядзе былі маланкавыя стрэлы. — Ну! У кагосьці рукі свярбяць? Што, на тых, хто маладзейшы і слабейшы, цяпер у вас сіл хапіла?!

— Не, мы яго не чапалі!

Райфа апа хутка прайшла на сярэдзіну пакоя і цвёрдым абцасам гучна тупнула па падлозе.

— Не хлусіце! Ні з таго, ні з сяго навошта яму так галасіць?

— Мы самі пачулі плач і прыйшлі сюды. Рустам тут быў адзін. А што адбылося — мы не ведаем.

Рустам па характары — замкнёнае дзіця. З першых дзён у дзіцячым доме ён, нібы вады ў рот набраў, ні слова не прамаўляе. Нават на пытанні «як завуць?», «адкуль ты?» зусім не адказвае, толькі нізка апускае галаву ці робіць выгляд, што не чуе. Хлопцы шапталіся паміж сабой, што, напэўна, ён крыху не ў сабе, а можа, і зусім глуханямы. Неўзабаве ўсё стала зразумела. Выхавальніца расказала пра яго.

Аднойчы ў халодны буранны дзень каля кантэйнера са смеццем дворнік знайшоў скрутак, з якога ішлі ледзь чутныя гукі. Як жа ён быў уражаны, убачыўшы ў гэтым скрутку жывое немаўля. Дакументаў пры ім ніякіх не было. Спачатку дзіця накіравалі ў Дом малюткі, пасля — у прытулак. Калі прыйшла пара ісці ў школу, яго перавялі ў дзіцячы дом.

Як ні стараліся, але імя дзіцяці даведацца мы так і не змаглі. А да яго трэба ж было неяк звяртацца. «Быццам яго Рустамам завуць», — сказаў нехта з нас, нібыта зрабіў тым самым вялікае адкрыццё для ўсіх. З тых часоў і сталі называць новага хлопчыка Рустамам. Ён нават пачаў рэагаваць на гэтае імя. Праз месяц Рустам ужо размаўляў, хоць спачатку абмяжоўваўся кароткімі «так» і «не».

Неўзабаве з горада даслалі асабістыя дакументы, і ён ужо змог наведваць школу. Аднак з гэтых дакументаў высветлілася, што хлопчыка завуць Буранаў Ільнур. Гэтае імя яму далі ў гонар о дворніка, які выратаваў яму жыццё. А прозвішча навеяў буран, які быў у той халодны зімовы дзень... У дзіцячым доме яго працягвалі называць Рустамам, бо ўсе паспелі прывыкнуць да гэтага імя.

Аднойчы з ім адбылася незвычайная гісторыя... Кожны дзень пасля абеду Рустам пачаў кудысьці знікаць. З'яўляўся ж прыкладна праз гадзіну, і пры гэтым у яго быў добры настрой. Неўзабаве яго знікненні пачасціліся, і мне захацелася даведацца, куды ж ён ходзіць. Я вырашыў прасачыць за ім.

Вось Рустам выйшаў з дзіцячага дома і адразу накіраваўся да бярэзніку, што віднеўся за будынкам. Я ціхенька ішоў за ім следам, імкнучыся заставацца незаўважаным.

Калі мы зайшлі ўглыб лесу, хлопчык спыніўся, і раптам абняўшы беленькую стройную бярозку, стаў нешта хутка і перарывіста шаптаць. Якія словы ў гэты момант прамаўляў Рустам, пачуць было немагчыма. Ён дзяліўся з дрэвам сваім патаемным. Час ад часу падымаў вочы да неба і ўсміхаўся. Часам па-дзіцячы сціраў далонькамі слёзы, якія ліліся па шчоках. Мне не хацелася парушаць яго ўзрушаны стан, і я вырашыў адысці. Але тут Рустам мяне заўважыў. Здрыгануўся ад нечаканасці, выраз твару памяняўся.

— Не кажыце пра гэта нікому, калі ласка.

Я ўпершыню чуў голас Рустама.

— Добра, нікому не скажу. А што ты робіш тут адзін, у лесе?

— Я баюся гаварыць у дзіцячым доме пра тое, што думаю, — Рустам адчуваў сябе няёмка. У яго задрыжалі вусны, і ў голасе прагучалі ноткі віны. — Калі я раскажу каму-небудзь свае сакрэты, ён можа расказаць усім, і мяне будуць дражніць. А вось гэтая бярозка — мой верны сябар. Яна мне ніколі не здрадзіць. Ёй я магу расказаць усё, што ўтрымлівае сэрца. Не ведаю, чаму, але толькі ў лесе адчуваю сябе свабодна і лёгка. Тут я магу памарыць, нават уявіць сваю будучыню.

— А якая яна, твая мара? — пацікавіўся я асцярожна.

— Ведаеш, ага, я мару, калі вырасту, стаць вялікім чалавекам, — вочы Рустама заіскрыліся, у іх зайграла жыццё. — Вось іду я па Уфімскіх вуліцах, у руках у мяне чорны партфель, я апрануты ў прыгожы касцюм, беласнежная кашуля, нават гальштук ёсць, а як асляпляльна блішчаць чаравікі!

Рустам пры гэтых словах нават выпрастаўся, ён нібы наяве пражываў мару, адчуваў сябе ў гэтыя хвіліны дзелавым чалавекам, кіраўніком.

— Тыя, хто ведае мяне, спыняюцца, вітаюцца. А я радуюся і працягваю свой шлях. І няма ў гэтую гадзіну на зямлі чалавека, шчаслівейшага за мяне! Дома чакае сям'я — любімая жонка і дзіця…

У гэты момант Рустам запнуўся і зноў расплакаўся.

— Ну, не плач! Усё будзе так, як ты захочаш, бо ў цябе наперадзе ўсё жыццё! — я стараўся падабраць словы, каб супакоіць яго.

— Так, яно, вядома, канешне... Але, калі мае дзеці стануць дапытвацца, дзе іх бабуля і дзядуля, што я ім адкажу?

У мяне не было слоў. Я добра разумеў яго, але чым мог дапамагчы? Шмат гадоў прайшло з таго часу, як не стала маіх бацькоў. І ўсё ж мне здалося, што Рустам нашмат шчаслівейшы за мяне. У яго заставалася надзея. Кажуць, што яго бацькі жывыя, толькі ніяк не могуць знайсці свайго сына. Аднойчы яны абавязкова сустрэнуцца!

— Ільяс ага, я веру, што мяне забяруць з дзіцячага дома! І мая вера заўсёды са мной! — твар хлопчыка прасвятлеў. — Трэба проста крыху пацярпець.

— Вядома! Такога разумнага хлопчыка, як ты, тут дакладна не пакінуць!

— Як вы думаеце, калі прыедуць па мяне? А раптам я ў гэты час буду ў летнім лагеры? Тады ім прыйдзецца доўга мяне шукаць. А маме будзе вельмі цяжка, калі яна мяне адразу не ўбачыць, — цяпер хлопчык казаў больш свабодна. — Я вельмі даўно не прамаўляў слова «мама». Ужо стаў забываць, як яно гучыць. Вось калі прыходжу сюды, да бярозкі, згадваю гэтыя дарагія словы: «мама», «тата». Якія ж гэта прыгожыя словы, так, ага? — Рустам паглядзеў на мяне сваімі карымі, поўнымі слёз вачыма. Потым ціха вымавіў: «Мама! Тата! Я люблю вас!»

Маё сэрца нібы прапякло агнём. І хоць я быў нашмат старэйшы за Рустама, цяпер ужо сам не змог стрымаць слёз.

— Калі ласка, нікому не кажы пра гэта, — папрасіў мяне Рустам.

— Добра, не скажу…

Мы, не спяшаючыся, накіраваліся ў бок дзіцячага дома.

Рустам, які сядзеў цяпер на краі ложка, патроху супакойваўся. Мы не спяшаемся сыходзіць, пакуль не даведаемся прычыну гэтых бурных слёз. Выхавальніца таксама заставалася з намі. Рустам падняў галаву, рукавом выцер пачырванелыя вочы і зірнуў на нас.

— Пачакай, пачакай... — ён спрабаваў праз усхліпванні нешта сказаць, але заплакаў яшчэ гучней. Мы застылі ў здзіўленні.

— Ну, хопіць, супакойся ўжо! Хочаш, падару табе сваю новую бейсболку? — аднакласнік нацягнуў Рустаму на галаву сваю бейсболку, падараную сваякамі. Хтосьці падаў яму шклянку з вадой. Зрабіўшы некалькі глыткоў, Рустам быццам бы заціх. Праз некаторы час усё высветлілася:

— Я заўжды гляджу па тэлевізары перадачу «Чакай мяне», яшчэ ні адну не прапусціў. — Рустам казаў крыху пакрыўджаным голасам. — Ну чаму людзі заўсёды кагосьці шукаюць і абавязкова знаходзяць? Вось і сёння мама знайшла свайго сына. Яна так моцна прыціснула яго да сябе! Я чакаю, што мяне таксама будуць шукаць па тэлевізары! Чакаю! Але нікога няма... Няўжо я зусім нікому не патрэбны?! Напэўна, не патрэбны…

У пакоі запанавала маўчанне.

Пераклад з рускай Алены СТЭЛЬМАХ

Фота Кастуся Дробава.

«О, Урал святы, зямля мая, ты —

Салават ЮЛАЕЎ

Клятва

Юрузань, дарагая рака!
Меч булатны сціскае рука.
Я на ворага йду і даю
Табе цвёрдую клятву сваю:

Хай знявечаць мяне і распнуць,
Хай мне вочы і вушы праткнуць,
Хай адрэжуць і нос, і язык, —
Не пачуюць мой жаласны крык!

А без носа адчуць я змагу
Водар хваль, іх пяшчоту й тугу,
Без вушэй жа пачуць я гатоў
Шэпт крыніц, цішыню чаратоў…

Страла

Сляпую ў неба я стралу пусціў
І ластаўку падбіў у вышыні.
Цяпер яна ля ног маіх трымціць.
Шкада. Згасаюць у вачах агні.

Праз горы і лясы, нібы прамень,
Крылатая страла, ізноў ляці!
Не ластавак збіваць маёй страле,
А ворага падступнага знайсці!

Юнаку-воіну

Лятае крумкач высока ў небе,
А яшчэ вышэй — бясстрашны сокал,
Хоць драпежных шмат істот навокал,
Птушак гасудар — магутны беркут.

Будзь як гэты беркут, слаўны воін,
Будзь сябрам апораю стальной,
З ворагам на бой выходзь дастойна,
Не шкадуй жыцця, кідайся ў бой!

Туга па Радзіме

Край нябёснае красы,
Рэкі, скалы і лясы,
Родных птушак галасы,
Жыватворны мой Урал!

І Радзіма ты мая,
І жыццё, й любоў мая,
І самота ты мая,
Жыватворны мой Урал!

Статкі я твае люблю,
Я лугі твае люблю,
Я снягі твае люблю,
Жыватворны мой Урал!

Я сваёй любоўю чысты,
Як дажджом абмыты ліст,
Як птушыны ранкам свіст,
Жыватворны мой Урал!

На чужыне сам сумую,
Па тваіх лясах сумую,
Па тваіх гарах сумую,
Жыватворны мой Урал!

З башкірскай.
Пераклад Рагнеда МАЛАХОЎСКАГА

Гульназ КУТУЕВА

Шчаслівая па-свойму

Ад бед нязначных не тужу —
Шчаслівая па-свойму.
Пусціла шчасце я ў душу —
Яно жыве па-мойму.

Жыццё каб падпарадкаваць
Сваёй жаночай волі…
Патрэба будзе — й падкаваць
Шалёны поступ долі.

Расчэрчана мая далонь
Не трафарэтам ліній.
Прароцтва іх — вада, агонь
Ды медных трубаў плыні.

Ды кожны штрых, што на руцэ —
Ён толькі мой. І кропка!
Вось шчасце, зноў яно й яшчэ —
Чытаю нетаропка.

Свой воз праблем сама цягну —
Сама за ўсё ў адказе.
Па сілах і бяру віну,
Учынак як не ўразіў.

А за дабро плачу ўтрая
Любому чалавеку.
Штодня за мір малюся я
Ўсявышняму і веку.

Таратаў

Гара Таратаў — пуп зямлі,
Моцным вузлом
Звязала ты парасткі жыцця.
Ноеву каўчэгу —
Прыстанішча.
Ты — грозны суддзя і яблык раздору.
Наскрозь сутнасць чалавечую бачыш.
Цяжэй за каменныя глыбы на шалях тваіх
Сумлення зярняткі.
Але ж і злодзею
не схаваць камень за душой.
Для праведніка ты —
месца сілы.
Злому — адпомсціш забыццём.
Гара Таратау — пуп зямлі,
пачатак пачаткаў…

Натхненне

Калі нараджаецца
трапяткі радок верша,
я чую, як спяваюць Анёлы.
Сусвет мяне люляе ў далонях.
І сам Усявышні дорыць натхненне.
На крылах шчасця
Магу зямлю абляцець,
Каб падзяліцца
дадзенай паэту радасцю
словастварэння.
І ціха, вельмі ціха
пастукацца ў сэрца тваё:
песню кахання праспяваць.

Адчай

Пабачу голле яблыняў у сне,
Карэнне незжывелае ў зямлі…
З сыходам маці страціў нешта сад.
З сыходам маці яблыні сышлі.

Як мёд густы, цячэ з галін апад.
Цячэ мядком, у райскі сад прычым.
Дабро зямное з мацеркай сышло,
А можа быць, прычына ў іншым чым?

Пабачу голле яблыняў у сне,
Пачую ў небе спеў птушыных зграй.
Я ведаю — час з птушкамі ляціць,
Акрэсліўшы трохкутнікам адчай.

Прарочы сон: як кажуць, у руку.
Прыйшоў ён папярэдзіць, што наўрад
У іншы бок вада ўжо пацячэ,
І стрэлак ход павернецца назад.

Пабачу голле яблыняў у сне,
Асмяглі, перасохлі карані.
Жыццё не дорыць вільгаці зусім.
Нічога мне ў мінулым не змяніць…

Ведаю

Я ведаю, што адказаць
на ўсе свае пытанні.
Як жа ў руках сябе трымаць,
калі прыйшло каханне?

Табе я снежкаю ў акно
шпурляю ў холад люты.
З нябёсаў голас чую зноў:
«Навошта ўсе пакуты?

Навошта сэрца адкрываць
наіўна, без разбору?
Вучыся горкае прымаць,
схавай гарачы нораў!»

Адказы ведаю сама
на ўсе свае пытанні.
Ды, як ахвярнае ягня,
кручуся на закланні.

Прымаю, быццам бы няўзнак,
людскія перасуды,
Але ў акно тугі камяк
ляціць праз паўмінуты.

З башкірскай.
Пераклад Іны ФРАЛОВАЙ

Ларыса АБДУЛІНА

Башкірская мова

Башкірская мова —
Ты старажытны воін.
Праз бездань вякоў
Чую грозны покліч
Перамог былых!
Бачу іскры,
Што высякае меч твой,
Цяпло іх
праз мінулае саграе далоні.
Мужнасці тваёй
Увасабленне,
Адвагі непахіснай —
Слаўны Салават.
Пад тваімі сцягамі
Дабро абараняў.
Шчытом тваёй годнасці
Сказіцелі ўставалі.
Пакуты без дакору прымалі,
Каб і без'языкімі
Веліч тваю ўслаўляць.
У ліхую гадзіну
Дыханне тваё святое,
Як вуголле пад попелам,
У вёсках зберагліся.
Веліч дзяржавы
На сваіх плячах трымаеш.
Як немаўля да сэрца хіну цябе,
Жыццё маё,
Будучыні заклад,
Адгукніся,
Ведаю, што жывая.
І сёння стралой ляціць твой радок
Здрадніку ў сэрца.
Каб узвысіць веліч былых перамог!

* * *

Хораша было б вярнуць юнацтва!..
Расчыню ў мінулае акно
Ды на крылах за вясёлым птаствам
Палячу, дзе й ветру не чутно.

Хай бы крылы, як знаёмых даўніх,
Неслі ў стэп, на родную зямлю.
Там схавалі б ад вачэй цікаўных
Белыя султаны кавылю.

Да грудзей прыльнула б як калісьці
З хваляваннем скрадзеных нявест,
Як трапеча пад дажджамі лісце,
Як трапеча перад бурай лес.

І пакуль з каня рукою цвёрдай
Ты ірваў мне ў полі касачы,
Скакуна другога з цёплай мордай
Асядлала. Зноў, каб уцячы.

У святле барвовым лёг бы вечар
Абагрэцца з намі ля кастра.
Жыў народ і будзе жыць так вечна,
Хто дабро шукае ад дабра?

За духмяным чаем каля юрты
Пранясуцца думкі-скакуны:
Мы з табою, любы, не манкурты
І ніколі імі не былі.

Клятва

Быць нам — і толькі такімі.
Ці ўжо наогул не быць.
З Богам, з яго светлым імем
Нам на зямлі гэтай жыць.
Долу разлад і праклёны,
Долу пакрыўджаны плач!
Слухайце, як утрапёна
Дзьме яснавокі сурмач:
Маці, Радзіма і мова —
Свята ў душы беражом.
Першапачатак, аснова —
Слова бацькоўскае, дом.
З працы нястомнай ды будняў
Клятва куецца заўжды.
Час на кавадле марудна
Перакуецца ў гады.
Хвілі, гадзіны, эпоха —
Вернасць — закон па крыві.
Хлеба духмянага бохан —
Лепшае што назавіў..
Праца, адзінства і згода —
Наш па кавадле замах.
Еднасць куецца народа,
Еднасць — адзіны наш шлях.
Быць нам такімі прыстала,
Значыць такімі і быць!
Будзем на кручах і скалах
Гнёзды арліныя віць,
Каб над магутным Уралам
Век арлянятам кружыць!

Слова сучаснікам

Калі хто запытаецца пра мову,
Ім адкажы: яна ў тваёй крыві,

мой бацька, сын твой верны я!»

Што слова роднае — найпершая ахова,
Ад нараджэння знак твой радавы.

Каштоўнасць перадаць павінен сыну,
Хай ад цябе пачуе першым сын
Пра мову гімны, гімны пра Айчыну
І пра Урал, дзе знойдзеш ты спачын.

Згадай нашчадку волю Салавата,
На словах сыну перадай наказ:
«Я не памёр, магілаю мне краты!
Мой дух, башкіры, у вяках не згас!»

Пра Муціных дабро, зло Тахтамыша,
Бы песня Бабіча, няхай гучыць званчэй.
Над маўзалеем Бэндэбікэ ціша
Узнімецца легендаю хутчэй.

Няхай нашчадак ад цябе пачуе
Пра творчы подзвіг Хадзіі — «Іргіз».
Хай ведае, якую долю злую
Жыццё ёй даравала, пра дэвіз,

З якім прайшла няшчасці і нягоды,
Які вялікі помнік узвяла
Башкірскай мове, краю і народу,
Дачкой якога Хадзія была.

Ты сыну перадай, як сцяг, імёны!
Не страціць ён тады арыенцір.
І твой унук адкажа утрапёна
На запыт: «Хто ты?» — годнае: «Башкір!»

З башкірскай.
Пераклад Іны ФРАЛОВАЙ

Руслан СУЛЕЙМАНАЎ

Пакінутая шаль

Ты шаль пакінула, але яе цяпло
Мяне сагрэе у начы халоднай
І вобраз твой, такі пяшчотны, родны,
І ўсё, што з намі у жыцці было.

Яна хавае тонкі арамат
Духоў тваіх і светлы міг пачуццяў.
І ўсёй душою я ізноў адчую,
Што праляцела столькі дзён назад.

Ты шаль пакінула. Ужо прыйшла вясна,
А радасці няма — ты не са мною.
Ды светлаю хвілінай, чыстай мрояй
Нагадвае ізноў цябе яна.

Тваё пісьмо

Атрымаў твой ліст, а ў ім
Толькі кропкі: раз, два, тры…
І мой твар увесь гарыць
Дзіўным полымем зары.

Можа, ты ў журбе па нас
І не можаш перадаць
Праз увесь прайшоўшы час,
Што хацела мне сказаць?

Можа, не хапіла слоў,
Каб у тым пісьме адчуў
Сэрца сцішанага зоў,
Слёзы шчырасці ўваччу?

Каб паперы чысты снег
Зноў падкрэсліў для мяне
Усё, што мроілася мне
У дзівосным даўнім сне.

Хай пісьмо тваё без слоў,
Хай не літары — снягі,
Ды яго адчую зноў
Светлым шчасцем дарагім.

З башкірскай.
Пераклад Навума ГАЛЫПЯРОВІЧА

Танзіля ДАЎЛЕТБЕРДЗІНА

Парыў

Адолеўшы зямное прыцяжэнне,
Мяне імчыць да зор душа мая.
Пяро хапаю ў гэтыя імгненні,
Парыў натхнення адчуваю я.

Але мацней пяра мяне трымаюць
Мае сыны — святло маіх вачэй.
Я іх з пяшчотай, з ласкай абдымаю,
І з зор дамоў вяртаюся хутчэй.

Бяру ў далонь маленькія іх рукі,
Гуляю ў гульні з імі зноў і зноў…
Хай сэрцам чую я галактык гукі,
Ды мне прыемней смех маіх сыноў.

Стары гадзіннік

Па ўзросту ты, гадзіннік, для мяне
Не бацькам, а дзядулем быць павінен.
І хоць ты — нерухомы на сцяне,
Ды ўсё ж працуеш кожную хвіліну.

Няпроста гэта для тваіх гадоў
(А тых гадоў адстукаў ты багата!),
І ўсё ж да працы ты заўжды гатоў,
І стрэлкі ўсё брыдуць па цыферблаце.

Брыдуць і ўсё спрабуюць не адстаць,
Брыдуць і адстаюць, на жаль, замнога…
Ды ўпарта не жадаюць адступаць,
Сысці хоць раз з маршруту кругавога.

Мне б замяніць цябе, гадзіннік мой,
Купіць другі… Ды не магу расстацца!
Гадзіннік — частка памяці маёй,
А з памяццю няпроста развітацца!

* * *

Паміж намі глухая сцяна
І раз'юшаны дождж праліўны.
Б'ецца хваля, жадае яна,
Каб не стала між намі сцяны.

Бо сцяна — гэта наша віна,
Тут і праўда падманам гучыць!
Я адзін, ты таксама адна…
І не зможа нас хваля злучыць!

Паміж намі глухая сцяна…

Адданасць

Як кудысьці ад'язджаю я,
То цябе, Башкірыя мая,
Мушу я з сабою забіраць,
Каб ля сэрца памяць захаваць!

Абаронцы роднае зямлі
Для нашчадкаў край свой бераглі,
Засланялі родны край сабой,
З песнямі ішлі ў смяротны бой!

І таму да скону, колькі жыць,
Буду я зямлі сваёй служыць,
Зберагаць свой непаўторны свет!
Гэта мне ад продкаў запавет.

О, Урал святы, зямля мая,
Ты — мой бацька, сын твой верны я!
Хай шчаслівым будзеш ты заўжды,
Хай твой люд не зведае бяды!

Хай не дзьмуць там лютыя вятры,
Вестуны зімовае пары!
Хай не паліць сонца ўсё наўкол,
А ласкава песціць лес і дол!
І заўсёды, дзе ні буду я,
Ты са мной, Башкірыя мая!

Падзенне

Ёсць у падзенні на каменне
Адзін сыход для рук, для ног…
А вось з зямлёю сутыкненне
Ты б перажыць, напэўна, змог.

Бо літасць ёсць для чалавека
У нашай роднае зямлі…
І стэпы так жывуць ад веку.
А гарады, яны змаглі б?

На гэта адкажыце самі,
Па гулкіх вулках спакваля
Праходзячы… Душа — не камень!
Душа — яна, хутчэй, зямля!

Мы па жыцці плывём старанна
Без ветразя і без руля…
А потым нам загоіць раны,
Як матухна, сама зямля!

Восеньскія яблыкі

О, верасень, ты яблычны кілім
Навошта ў нашым садзе раскідаў?
Прыродзе-маці што ў кіліме тым?
Ты ёй дарэмны падарунак даў!

Не бачыш, пэўна ж, ты сваёй правіны
У тым, што садавіна згніць павінна?
А на галінцы яблычак адзіны
З багатай той застаўся садавіны.

Яго, напэўна, зберагае лёс?
Але зайздросціць яблычак да слёз
Суродзічам… Іх людзі падбіраюць
І ў кошыках кудысьці дастаўляюць.

Вось так і на жыццёвым дрэве мы
Чакаем восенню прыход зімы.
Дык, можа, лепей тым, што ападуць?
Іх хоць у кошык потым пакладуць…

З башкірскай. Пераклад Генадзя АЎЛАСЕНКІ

Святлана ЧУРАЕВА

Амазонка

У мяне скончыліся стрэлы.
У лука лопнула жыла.
І цецівы цела
Нацягнутае застыла —
У мяне скончыліся стрэлы.
Толькі мой конь ашалелы,
Задраўшы бессаромныя губы,
Дрыжыць ад вар'яцкае схваткі.
Бакі сціскаюць груба
Мае агрубелыя пяткі.

Варвар, а я б хацела
Кіпячым агнём сцячы
Ад смаку,
Укуса
Тваіх акрываўленых вуснаў?
Але ты дурны.
І ў цябе смерць на мячы,
А ў мяне скончыліся стрэлы.

Я з палымнеючым горлам
Валюся каню на спіну,
І ў трупе маім голым
Яшчэ жыве мая палавіна
Нашага сына.

Я з палымнеючым горлам
Наглыталася сталі,
Ляжу ў пыле ля тваіх сандаляў.

І ў пыле ля тваіх сандаляў
Ужо памрэ твая палавіна
Нашага сына.
Ні яго. Ні мяне. Гуляюць,
Грызуцца паблізу коні.
Ты адзін.
Выціраеш
Нікчэмную гразь з далоні.

* * *

Даўно гаспадары зямлі —
Вайна і Голад, Мор і Смерць,
і толькі разам мы б змаглі
супраціўляцца ім сумець.

А мы як быццам не ў баях,
нібыта час наш не прыйшоў,
яны ж нясуць бяду і жах,
і праліваецца ўсё кроў.

Ужо над намі чорны дзень
касы гіганцкага жняца —
але не бачна шчэ канца
у нашай бегатні нідзе.

Даўно пара табе і мне
абняцца, грэцца, не гарэць,
пакуль на яве, а не ў сне
Вайна і Голад, Мор і Смерць.

На пяць хвілін, на ўздых, на міг —
не важна. Толькі знаю я,
што ўспыхне не каса для ўсіх,
а зорка Віфлеемская.

* * *

Урэшце прычакаеш ветру —
ад рыфаў не пазбегнуць ран,
расправіш анямелы ветразь,
а там — адкрыты акіян.

Хай лопнуць ланцугі, вяроўкі,
хай вырве левы борт — наплюй.
Прабоіну залепіць лоўка
хваль пацалунак, не сумуй.

Ён будзе мокрым і не рэзкім,
але ты з вызваленым дном
закруцішся імклівай трэскай
у ледзяным віры з агнём.

Спазнаўшы дрыжыкі ў свабодзе,
ты будзеш іх заўсёды сніць,
і ўжо не зроўніш з мелкаводдзем
святло і жахі глыбіні.

Неўтаймавана і, як вецер,
сярод фрэгатаў, лет і зім
плыві бясконца па сусвеце,
дзе гаваняў няма зусім.

Дзе ўжо прымаецца за гавань
утульны і вандроўны блік,
дзе, развучыўшыся ўжо плаваць,
ўрастаюць судны ў мацярык.

Пераклад з рускай Віктара ШНІПА

Не шкадуючы жыццяў

Адна са старонак беларуска-башкірскага літаратурнага сяброўства — гэта далучанасць да лёсу нашага сінявокага краю, да нашай лясной і азёрнай Беларусі башкірскіх паэтаў і празаікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. Раскажам хаця б некаторыя старонкі гэтай часткі ў біяграфіі нашай літаратурнай дружбы.

У вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прымаў удзел паэт, празаік, драматург Шарыф Сагадатулавіч Бікулаў (1924—1995). Заслужаны работнік культуры РСФСР, лаўрэат прэміі імя Г. Саляма. У вайну ён займаў пасады камандзіра агнявога ўзвода, камандзіра артылерыйскай батарэі. Шарыф Бікулаў у складзе падраздзяленняў, вайсковых злучэнняў Заходняга фронту, 3-га Беларускага фронту вызваляў Смаленшчыну, некаторыя раёны Беларусі. У 1944 годзе пісьменнік быў цяжка паранены і пасля лячэння ў шпіталях дэмабілізаваны. Ш. Бікулаў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, «Знак Пашаны», баявымі і юбілейнымі медалямі. Яшчэ на фронце Шарыф Сагадатулавіч уступіў у члены КПСС. Вярнуўшыся дадому, дваццацігадовы ветэран вайны паступіў у Башкірскі дзяржаўны педагагічны інстытут. Закончыўшы вучобу, Бікулаў працаваў выкладчыкам, загадчыкам вучэбнай часткі ва Уфімскім тэатральным тэхнікуме. У 1952—1962 гадах пісьменнік працаваў рэдактарам рэспубліканскага часопіса «Піянер» і газеты

Муса Галі.

«Піянер Башкартастана». З 1962 года Шарыф Сагадатулавіч — адказны сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Башкірскай АССР. Башкірскі літаратар — аўтар рамана «Мы яшчэ пажывём» (кніга пабачыла свет на башкірскай і рускай мовах), зборнікаў вершаў і паэм «Імкненне», «Сучасніку», «Успамінаючы мінулае», «На досвітку», «Цудоўны сон», «Калі б я ведаў…». Пад вокладкамі гэтых кніг — і «беларускія старонкі» Шарыфа Бікулава. Шмат башкірскі пісьменнік зрабіў і ў галіне мастацкага перакладу, пераўвасобіўшы на родную мову творы А. Пушкіна, М. Някрасава, С. Міхалкова, А. Макаранкі, Тактагула, С. Данілава…

У складзе 112-й Башкірскай кавалерыйскай дывізіі ваяваў паэт і драматург Кадыр Даян (1910—1975). Заслужаны дзеяч мастацтваў Башкірскай АССР. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, двойчы — «Знакам Пашаны». Разам з байцамі і камандзірамі легендарнага вайсковага злучэння лісупрацоўнік дывізіённай газеты Кадыр Даянаў (Кадыр Даян — гэта ўжо пісьменніцкі псеўданім) удзельнічаў у Гомельска-Рэчыцкай аперацыі ў лістападзе 1943 года. Азяршчына, Рэчыца, Краснаполле, Холмеч, Калінкавічы, Гомель — вось адрасы, якія звязаны з гэтай вайсковай аперацыяй. А ў студзені 1944 года башкірскія кавалерысты ўдзельнічалі ў Мазырскім рэйдзе, у вызваленні Мазыра. Пасля вайны пісьменнік (а друкавацца Кадыр Даян пачаў яшчэ ў 1929 годзе) працаваў рэдактарам Башкірскага кніжнага выдавецтва, затым — літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў Башкірскай АССР. Загінуў паэт 19 кастрычніка 1975 года, выратоўваючы дзіця, якое ўпала на чыгуначныя рэйкі на станцыі Чышмы-Уфа. Кадыр Даян — аўтар многіх п'ес, казак для дзяцей, якія і цяпер чытаюць хлопчыкі і дзяўчынкі Башкартастана.



Назар Наджмі.

Яркая асоба ў шматнацыянальнай расійскай літаратуры — народны паэт Рэспублікі Башкартастан Назар Наджмі (1918—1999). За свае творчыя здзяйсненні пісьменнік адзначаны Дзяржаўнай прэміяй РСФСР імя М. Горкага, Дзяржаўнай прэміяй Башкірскай АССР імя Салавата Юлаева. Літаратар удзельнічаў у вызваленні Беларусі, Малдовы, Польшчы. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі; за творчую працу адзначаны ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Назар Наджмі — аўтар многіх паэтычных і празаічных кніг. Яны пабачылі свет на башкірскай, рускай, татарскай мовах. Выйшаў ва Уфе і трохтомны збор твораў Н. Наджмі. Удзячныя землякі надзіва шмат зрабілі для захавання памяці пра таленавітага творцу. У сяле Міншты Дзюрцюлінскага раёна, дзе нарадзіўся пісьменнік, працуе Дом-музей народнага паэта. Імя Назара Наджмі носіць гімназія ў горадзе Дзюрцюлі.

Хакім Гіляжаў.

Пры фарсіраванні Дняпра быў цяжка паранены башкірскі паэт Муса Галі (1923—2004). У час вызвалення Беларусі ад фашыстаў ён — памочнік камандзіра ўзвода. Савецкі і расійскі башкірскі паэт Муса Галі пачаў займацца літаратурнай дзейнасцю яшчэ ў час даваеннай вучобы ў Даўлеканскім педагагічным вучылішчы. Вярнуўшыся з вайны, закончыў Башкірскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, затым, у 1965-м, — Вышэйшыя літаратурныя курсы. Першы зборнік вершаў Мусы Галі — «Светлы дзень» — пабачыў свет у 1953 годзе. Спадчына творцы складаецца болей чым з 40 паэтычных кніг. Публіцыстычныя, літаратурна-крытычныя артыкулы башкірскага мастака слова аб'яднаны ў зборніку «Кветкі і зоркі» (1981). У 1979 годзе паэт атрымаў Дзяржаўную прэмію Башкірскай АССР. У 1982 годзе — званне заслужанага дзеяча культуры Башкірскай АССР. У родным сяле імем пісьменніка названы вуліца і сярэдняя школа. Муса Галі ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў.

Вызваляў некаторыя раёны Беларусі і башкірскі празаік Галі Ібрагімаў (1918—1989). Заслужаны работнік культуры РСФСР, заслужаны работнік культуры Башкірскай АССР, лаўрэта Дзяржаўнай прэміі БАССР імя Салавата Юлаева, ён пакінуў значны след у башкірскай нацыянальнай літаратуры. У 1959—1973 гг. Галі Ібрагімаў — намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Агідэль», галоўнага башкірскага пісьменніцкага выдання. Галоўны твор празаіка — раман «Кінзя», па якім зняты шматсерыйны мастацкі фільм. Твор прысвечаны тэме ўдзелу башкіраў у паўстанні Емяльяна Пугачова.

Падзеям Вялікай Айчыннай вайны прысвяціў многія свае творы празаік, паэт і журналіст Дзініс Ісламаў (1921—1973), які таксама ваяваў у Беларусі. За баявыя подзвігі пісьменнік узнагароджаны чатырма баявымі ордэнамі — Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў, а таксама медалямі. Пяру таленавітага башкірскага мастака слова належаць кнігі «Гады і дарогі», «Тры сустрэчы», «Зеелаўскія вышыні», «Дарога Масквы», «Паўднёвае сонца», «Шчодрая зямля», «Дзяўчаты»…

…Усяго 36 гадоў пражыў башкірскі празаік, паэт і журналіст Дзім Баязіт (1909—1945). З 1932 года ён служыў у пагранічных войсках. Спачатку на Далёкім Усходзе. З 1934-га — палітрук, затым — камісар палка. Прымаў удзел у баявых дзеяннях на возеры Хасан і на Халхін-Голе ў Манголіі. У пярэдадзень Вялікай Айчыннай злучэнне, у якім служыў пісьменнік, перакінулі на заходнюю мяжу СССР. 22 чэрвеня 1941 года Дзім Баязіт быў сярод тых, хто першымі прыняў на сябе ўдар фашысцкай армады. Адступаючы праз гарады і вёскі Беларусі, Смаленшчыны, літаратар адчуў на сабе ўвесь боль, усе пакуты простага люду, які заставаўся чакаць прыходу фашыстаў… Ззаду заставаліся Полацк, Віцебск, Жлобін… У баях пад Смаленскам Дзім Баязіт быў цяжка паранены. Але ізноў вярнуўся ў строй. І ўсё ж праз некаторы час пісьменнік дэмабілізаваўся з арміі па інваліднасці. У 1943—1945 гг. літаратар з'яўляўся супрацоўнікам Башкірскага абласнога камітэта Усесаюзнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў). Яшчэ ў 1936 годзе выйшаў першы зборнік апавяданняў Д. Баязіта «Ваенныя апавяданні», у 1941-м — другая кніга прозы «Франтавыя апавяданні», куды ўвайшлі і апавяданні пра першыя дні Вялікай Айчыннай вайны…

Беларусь ад фашыстаў вызваляў таксама паэт і празаік, заслужаны работнік Башкірскай АССР Ханіф Карымаў (1910—1983). Палітрук роты, камісар

Рамазан Кутушаў.

батальёна, карэспандэнт армейскай газеты многія свае франтавыя ўражанні ўклаў у мастацкія творы. Разам з баявымі ўзнагародамі — ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За абарону Масквы», «За ўзяцце Кёнігсберга» — Ханіф Карымавіч быў адзначаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў. Друкавацца Ханіф Карымаў пачаў яшчэ ў 1930 годзе. Першая кніга вершаў — «Песня вартавога» — выйшла ў 1934 годзе. Башкірскі літаратар — перакладчык паэзіі А. Пушкіна, М. Лермантава, А. Міцкевіча, іншых класікаў сусветнай паэзіі.

6 ліпеня 1944 года ў адным з баёў на тэрыторыі Беларусі загінуў башкірскі савецкі паэт Зінат Куціп (1918—1944). Да вайны працаваў настаўнікам гісторыі. У 1939 годзе Башкірскае дзяржаўнае выдавецтва выпусціла яго паэтычны зборнік для дзяцей «Вершы», куды ўвайшлі і творы пра барацьбу іспанскага народа з фашызмам. Мо варта ў час, калі ў свеце разгарнулася супрацьстаянне, калі грымяць выбухі снарадаў, пісьменніцкім арганізацыям Башкартастана і Беларусі заснаваць Літаратурную прэмію імя Зіната Куціпа?..

Кадыр Даян.

Вялікую Айчынную вайну сустрэў на подступах да Мінска паэт Нур Ісмагілаў (1919—1942). Цяжка паранены ў Беларусі, непадалёку ад Барысава, пасля доўгага лячэння ў шпіталі ён памёр 17 верасня 1942 года. Ваявалі ў Беларусі башкірскія пісьменнікі Аміры Гайнан (1911—1982), Рамазан Кутушаў (1924—2020), Хакім Гіляжаў (1923—1997). Вызваляў Горкі, Шклоў, іншыя беларускія паселішчы паэт Бадруш Мукамай, які загінуў у Латвіі.

…Відаць, да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці да 80-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне варта выдаць анталогію твораў тых пісьменнікаў Расіі, хто прайшоў сцежкамі нашага краю, хто застаўся ляжаць у беларускай зямлі. Гэта — і ўдмурцкі паэт Піліп Кедраў, і татарын Закі Нуры, які партызаніў у атрадзе Канстанціна Заслонава на Аршаншчыне, і партызан калмык Міхаіл Хонінаў, і класікі, добра вядомыя творцы рускай літаратуры Аляксандр Твардоўскі, Канстанцін Сіманаў, Міхаіл Матусоўскі, Яўген Далматоўскі, Барыс Дубровін… Такая анталогія памяці застанецца і для многіх наступных пакаленняў беларусаў і расіян, якім разам бараніць мір, якім разам супрацьстаяць варожай калатнечы.

Максім ПЯСЧАНСКІ

Арцём МАКАРАЎ:

«Беларускі глядач добразычлівы, ён нібы адчувае сутнасць дырыжорскай працы...»

У 2023 годзе пасаду галоўнага дырыжора Вялікага тэатра Беларусі заняў народны артыст Рэспублікі Башкартастан, лаўрэат прэміі «Залатая маска» Арцём Валянцінавіч Макараў, які распавёў «ЛіМу» пра горад дзяцінства, Башкірскі дзяржаўны тэатр оперы і балета, культурныя лакацыі рэспублікі, пра месца сілы і натхнення.

Фота Кастуся Дробава.

— Вы нарадзіліся ва Уфе. Якія ўражанні ўфімскага дзяцінства праз гады адчуваюцца як самыя яркія, важныя, цікавыя?

— Успамінаў, вядома, вельмі шмат. І адразу скажу, што за гэтыя гады Уфа змянілася ў лепшы бок, стала прыгажэйшай. Гэта адзначаю і я, і госці горада. А калі пра ўражанні, то адной з сапраўды важных з'яўляецца для мяне падзея, якая стала своеасаблівым імпульсам для заняткаў музыкай: калі мне было пяць гадоў, бацькі прывялі мяне на «Лебядзінае возера» Пятра Ільіча Чайкоўскага ў Башкірскі дзяржаўны тэатр оперы і балета. Дарэчы, тэатр у нас ва Уфе шыкоўны, чатыры глядацкія ярусы, яго часам яшчэ называюць «*La Scala* ў мініяцюры». Уражанні былі грандыёзныя, ад прыгажосці ўсяго, што адбываецца і гучыць, захоплівала дух, і мне, пяцігадоваму, захацелася займацца музыкай. Хто б мог падумаць у той момант, што я калі-небудзь прыйду на працу ў гэты тэатр, буду працаваць доўга і на высокай пасадзе, што так складзецца маё жыццё.

— Атрымліваецца, што ўжо ў раннім дзяцінстве ўсвядомілі сваё пакліканне і вырашылі прысвяціць сябе музыцы?

— Прызнацца, яшчэ ў 12-13 гадоў я не быў упэўнены, ці пайду па музычным шляху, але ўжо напрыканцы навучання ў сярэдне-спецыяльнай музычнай школе пры Уфімскім дзяржаўным інстытуце мастацтваў зразумеў, у якім кірунку рухацца. Аднак і «дзіцячы след» таксама прасочваецца: я заўсёды з вялікай цікавасцю і натхненнем працую на «Лебядзіным возеры».

— А каго б назвалі сваімі першымі настаўнікамі ў музыцы?

— Самы першы мой педагог у музычнай школе, Уладзімір Васільевіч Хватаў, па-сапраўднаму зацікавіў мяне музыкай. Хачу сказаць, што прынцыпова важна менавіта захапіць дзіця. Як паказвае практыка, вельмі лёгка адбіць жаданне вучыцца, а вось зацікавіць вучня, прывіць яму густ да заняткаў музыкай бывае зусім няпроста. Мне бачыцца, што сапраўднае майстэрства педагогаў дашкольнага і школьнага музычнага навучання заключаецца менавіта ва ўменні захапляць, уражваць дзіця, і мне ў гэтым сэнсе сапраўды пашанцавала.

— Напэўна, і надалей сустракаліся спагадныя і таленавітыя настаўнікі?

— Як музыканта, як асобу мяне сфарміравала мой педагог па фартэпіяна ў Акадэміі мастацтваў Людміла Іванаўна Аляксеева, прафесар. Калі ж казаць пра дырыжорскі напрамак, гэта Валерый Ігнатавіч Платонаў, вельмі вядомы ў Расіі, у розныя гады ён быў галоўным дырыжорам Пермскай оперы, Башкірскай оперы. Яшчэ, безумоўна, Аляксей Іванавіч Людмілін, які кіраваў Новасібірскім і Башкірскім опернымі тэатрамі. І, бясспрэчна, Генадзь Мікалаевіч Ражджественскі, асоба ўнікальная ў музычным свеце. У яго мне давялося вучыцца падчас стажыроўкі ў Маскоўскай кансерваторыі, і незабыўныя ўражанні ад рэдкіх сустрэч я беражліва захоўваю ў памяці.

— Мне бачыцца важным, што чалавек, які дасягнуў вышынь у прафесіі, памятае і шануе тых, хто дапамагаў яму, захапляў, падтрымліваў. У працяг тэмы навучэнства раскажыце, калі ласка, пра студэнцкія гады ва Уфімскім дзяржаўным інстытуце мастацтваў імя Загіра Ісмагілава.

— Студэнцтва прыйшлося на часы няпростыя, пачатак 2000-х гадоў. Было адчуванне, што трохі страчваецца прэстыж нашай прафесіі, але нягледзячы на гэта ў нас атрымаўся вельмі добры курс, і педагогі былі натхнёныя, гледзячы на нас, такіх кемлівых, руплівых. І хачу сказаць, што калі на курсе ёсць некалькі лідараў, то і ўсе падцягваюцца. Нам было цікава вучыцца і гутарыць, мы падтрымлівалі адно аднаго, слухалі музыку ў кабінетах гуказапісу (цяпер, у часы інтэрнэта, гэта нават складана камусьці растлумачыць!), хадзілі ў тэатры. Ужо на другім курсе я пачаў працаваць канцэртмайстрам хору, затым з салістамі, «з галасамі», і акампаніраваць мне заўсёды падабалася нават больш, чым саліраваць. А шчыра кажучы, калі ў маім жыцці з'явіўся тэатр, вучоба апынулася на другім плане.

— А як вы прыйшлі да дырыжыравання?

— Працуючы ў Башкірскім дзяржаўным тэатры оперы і балета, я прыглядаўся да ўсіх творчых працэсаў і, вядома, з вялікім піетэтам назіраў за ўжо згаданым мной Валерыем Ігнатавічам Платонавым, які ў той час быў галоўным дырыжорам. І, назіраючы, я зразумеў, што ўсе, скажам так, нябачныя ніткі ў тэатры сабраны ў руках аднаго чалавека. Кажу тут не аб пасадах, а менавіта аб творчасці. У нейкі момант, настроіўшыся рашуча, я заявіў аб сваёй цікавасці да прафесіі дырыжора, аб жаданні зразумець яе, і маэстра пайшоў мне насустрач. Адметна, што ў інстытуце мастацтваў не было спецыяльнага курса па дырыжыраванні, і я набраўся смеласці звярнуцца да дэкана, да кіраўніцтва з прапановай аб стварэнні факультатыва. Пазней гэта развілася ў асістэнтуру, перайшло ў стажыроўку, а ў выніку была адкрыта спецыяльнасць «Сімфанічнае опернае дырыжыраванне» з адпаведным вучэбным планам, прадметамі і дысцыплінамі, і я стаў першым вучнем і выпускніком. Можна сказаць, праклаў гэтую сцежку.

— А ў 2010 годзе сталі галоўным дырыжорам Башкірскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Чакалі прызначэння, рыхтаваліся да яго ці ўсё адбылося спантанна?

— Прызнаюся, гэта было ўжо трэцяе запрашэнне ад тэатра, і на яго я адгукнуўся. Першы раз хапіла мудрасці адмовіцца ад такой высокай і адказнай для 27-гадовага музыканта пасады. Усё было настолькі нечакана тады, я літаральна не спаў начамі, разважаючы, які выбар павінен зрабіць. А праз некаторы час, калі ўжо працаваў у Турцыі, да мяне звярнуліся другі раз, але на той момант жыццё ўсталявалася, у ім былі крыху іншыя прыярытэты. Трэцяя прапанова заняць пасаду галоўнага дырыжора тэатра зыходзіла ад тагачаснага міністра культуры, вядомага спевака Аскара Абдразакава. Я прыняў рашэнне абсалютна свядома, адчуў, што гатовы. А што тычыцца абавязкаў, звязаных з прызначэннем, то разуменне ўсіх працэсаў адбывалася, канешне, паступова. Было шмат цікавага ў працы, здараліся і памылкі, без іх таксама немагчыма развіццё. У выніку за гэты час Башкірскі дзяржаўны тэатр оперы і балета ўзяў новую вышыню. На нашы пастаноўкі сталі прыязджаць вядомыя крытыкі, мы пачалі выступаць на іншых пляцоўках, удзельнічаць у фестывалях, атрымліваць узнагароды. Словам, гэта быў значны і цудоўны перыяд жыцця ў маім родным тэатры.

— У чым, на ваш погляд, унікальнасць Башкірскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета?

— Сёння ў тэатры гучыць музыка вельмі розная, якая адносіцца да розных стыляў, эпох, напрамкаў. Непасрэднае дачыненне да гэтага маю і я, паколькі ў бытнасць маю галоўным дырыжорам мы ўпершыню звярнуліся да музыкі барока, паставіўшы оперу «Геракл» Георга Гендэля, з якой прынялі ўдзел ў фестывалі «Залатая маска». Безумоўна, жамчужынамі з'яўляюцца балет «Журавіная песня» і опера «Салават Юлаеў» Загіра Ісмагілава. Ды і ў цэлым менавіта нацыянальная опера, нацыянальны балет у тэатры рэспубліканскага значэння ствараюць непаўторную атмасферу. Унікальна таксама і тое, што ў рэпертуары тэатра знайшлося месца сучаснай музыцы, а менавіта оперы «*Vita Nuova*» Уладзіміра Мартынава. Перакананы, што галоўнае багацце тэатра – і Башкірскага дзяржаўнага, і Вялікага тэатра Беларусі — гэта рэпертуар.

— Вы з'яўляецеся ўладальнікам высокай тэатральнай узнагароды «Залатая маска», неаднаразова самі былі ў складзе журы фестывалю. Трэба меркаваць, гэта знакавыя падзеі і незабыўныя ўражанні?

— Калі нашага «Геракла» намінавалі на «Залатую маску», мы былі незвычайна ўзрадаваны. Ніхто і не марыў у той момант аб узнагародзе, галоўнае — нас заўважылі, і мы паедзем у Маскву і пакажам гэты спектакль. А калі на цырымоніі ўручэння раптам аб'явілі пераможцамі мяне і добра вядомую сёння выканаўцу Дзіляру Ідрысаву (мы атрымалі ўзнагароду разам), то былі шчаслівыя. Ды і сам факт, што тэатр не сталічны, што рэпертуар — барочны — даволі спецыфічны, але нас ўсё ж адзначылі, натхняў. А праз год пазванілі з аргкамітэта і запрасілі мяне ўвайсці ў склад журы. Дарэчы, менавіта першая работа (наогул жа ў журы я быў тройчы) уразіла надзвычай: прагляд спектакляў на розных пляцоўках Масквы, выезд у тэатры іншых гарадоў — усё новае, нечаканае, яркае. І я атрымліваў вялікае эстэтычнае задавальненне. І ўсё ж, прызнаюся, найбольш цікава апынуцца менавіта сярод удзельнікаў гэтага ўнікальнага фестывалю. Дзіўныя эмоцыі мы зведалі, трапіўшы нават у шорт-ліст «Залатой маскі» з операй «*Vita Nuova*» Уладзіміра Мартынава, якую паказвалі ў Маскве на Новай сцэне Вялікага тэатра.

— І яшчэ да пытання пра ўзнагароды. Вы — народны артыст Рэспублікі Башкартастан. Што адчулі ў той момант, калі даведаліся пра прысуджэнне такога ганаровага звання?

— Шчасце. І калі некалькі гадоў назад атрымаў званне Заслужанага артыста — гэта таксама было шчасце. Прызнанне тваіх дасягненняў кіраўніцтвам рэспублікі, несумненна, вельмі і вельмі прыемна. Акрамя таго, для мяне стала нечаканай навіна пра прысуджэнне звання, і таму, напэўна, было асабліва хвалюючa.

— Ваш творчы шлях звязаны і з Маскоўскім дзяржаўным акадэмічным Дзіцячым музычным тэатрам імя Наталлі Сац. Раскажыце пра гэты легендарны тэатр.

— Пачну з мастацкага кіраўніка тэатра Георгія Георгіевіча Ісаакяна, майго выдатнага калегі, з якім у нас шматгадовы творчы тандэм. Мы паставілі некалькі знакавых спектакляў для Башкірскага тэатра, у ліку якіх «Так робяць усе жанчыны» Вольфганга Амадэя Моцарта, «Геракл» Георга Гендэля, «Фаўст» Шарля Гуно, і ўсе гэтыя оперы сталі падзеямі тэатральнага жыцця. А праз нейкі час ужо Георгій Георгіевіч прапанаваў мне прыехаць у Маскву, дзе мы ажыццявілі пастаноўку оперы «Нуш-Нушы» Пауля Хіндземіта, прычым у канцэртным выкананні мы гэта зрабілі наогул упершыню ў Расіі. І сёння работа ў тэатры кіпіць. Цікава, што прапановы заняць пост галоўнага дырыжора практычна адначасова паступілі і ад яго, і ад Вялікага тэатра Беларусі.

— А як трапілі ў Вялікі тэатр Беларусі? Ці была прапанова нечаканай?

— Для мяне вельмі важным было тое, што ў кожным з тэатраў да мяне паставіліся з разуменнем, дзякуючы чаму я маю магчымасць працягваць рэалізоўваць свае ідэі на розных сцэнічных пляцоўках. А супрацоўніцтва маё з Вялікім тэатрам Беларусі пачалося раней, і першай работай тут стала опера «Макбет» Джузэпэ Вердзі, нязменна мною любімая. І пасля на працягу ўсяго мінулага сезона я ўліваўся ў творчы працэс, імкнуўся адчуць атмасферу тэатра, працуючы на операх «Самсон і Даліла» Каміля Сэн-Санса, «Аіда» Джузэпэ Вердзі, «Кармэн» Жоржа Бізэ, «Пікавая дама» Пятра Чайкоўскага. Я быў уражаны высокім узроўнем трупы, оперы, балета, майстэрствам салістаў, хору, аркестра. З велізарным задавальненнем я прыняў прапанову заняць пасаду галоўнага дырыжора Вялікага тэатра Беларусі.

— А якое ўражанне на вас зрабіў беларускі глядач?

— Адзначу, што беларуская аўдыторыя вельмі добразычлівая. Часам у тэатрах ёсць адчуванне, што не ўсе ў зале ўсведамляюць ролю дырыжора ў спектаклі. Дык вось беларускі глядач, па маіх назіраннях, вельмі тонка адчувае і разумее нашу працу. Прыём заўсёды надзвычай цёплы, эмацыянальныны, і, вядома, гэта вельмі прыемна.

— Што парэкамендуеце беларускім падарожнікам, якія вырашаць адправіцца ў Башкартастан, якія значныя культурныя лакацыі параіце?

— Башкартастан, Уфа — цэнтр розных культур. Башкірская, руская, татарская і іншыя знаходзяцца ў бесперапынным жывым узаемадзеянні адна з адной. У першую чаргу, я раю наведаць Башкірскі дзяржаўны тэатр оперы і балета. Несумненна, парэкамендую і Рускі драматычны тэатр з выдатнымі традыцыямі, і Башкірскі драматычны тэатр імя Мажыта Гафуры, і Уфімскі дзяржаўны татарскі тэатр «Нур». І, вядома, вялікую цікавасць для гледачоў уяўляе філармонія. Усё гэта прыкладна ў адной лакацыі Уфы, у цэнтры горада, і кожны можа выбраць цікавае менавіта для сябе.

— А якое менавіта ў вас месца сілы ва Уфе? Што з'яўляецца крыніцай энергіі і натхнення?

— Складанае пытанне... Ва Уфе я люблю бываць у тых мясцінах, дзе жыў, калі быў маленькі. Не ведаю чаму, але мне дастаткова проста пагуляць па гэтым кварталe, успомніць нейкія моманты дзяцінства, і становіцца добра, спакойна. А наогул, як і для многіх людзей, для мяне важна хадзіць у царкву, дзе атрымліваю каласальную энергію, дзе становіцца лягчэй, дзе я заўсёды адчуваю падтрымку.

Гутарыла Марына ЛЕБЕДЗЕВА

Скрозь стагоддзі

У Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва ўпэўнены: мастацтва фатаграфіі дапамагае выклікаць цікавасць да гісторыі і культуры. Узяць хаця б тэму недаўгавечнай архітэктуры… Па-першае, фатаграфія перадае прыгажосць і значнасць збудаванняў, а па-другое, захоўвае памяць аб мінулым. І архіўныя, і сучасныя здымкі — найважнейшая крыніца інфармацыі, сведчанне дасягненняў і памылак, росквіту і заняпаду.

Аляксандр Дзітлаў «Мінск. Від на вуліцу Савецкую», 1952 г.

Да 15 кастрычніка ў НЦСМ працуе выстаўка «Архітэктура скрозь стагоддзі», арганізаваная сумесна з Беларускім грамадзянскім аб'яднаннем фатографаў, Беларускім саюзам архітэктараў і Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў. Гэта прысвячэнне спадчыне Беларусі, і захаванай, і амаль страчанай, штуршок да вывучэння гісторыі архітэктуры. Мэта праекта — праз творчае бачанне навакольля фатографамі паказаць схаваныя дэталі і ўнікальныя асаблівасці будынкаў. Формы, матэрыялы, фарбы, нават гульня святла і ценяў у аб'ектыве фатографа здольны ператварыцца ва ўражальныя кампазіцыі. У звыклым — самабытнасць, у будзённым — непаўторнасць. Экспазіцыя дазваляе ўбачыць некаторыя помнікі архітэктуры, знакамітыя віды з розных ракурсаў і перспектыў, адчуць эмоцыі таго ці іншага аўтара здымка, яго стаўленне да аб'екта назіранняў.

Звяртаюць арганізатары ўвагу на патэнцыял фатаграфіі ў турыстычнай сферы, бо здымкі, вядома, удала выкарыстоўваюцца для прыцягнення турыстаў. Безумоўна, на Беларусі шмат прыгожых гістарычных будынкаў, прывабных і для жыхароў краіны, і для замежных наведвальнікаў. Многія адметныя мясціны сапраўды ўпадабаныя майстрамі фатаграфіі — гэтая акалічнасць уплывае на іх папулярнасць, віды становяцца пазнавальнымі. Няма патрэбы ў згадках, кожны зразумее, пра што можа ісці гутарка. І тут хацелася б зрабіць адступленне.

Ці магчыма падлічыць, колькі дастойных помнікаў архітэктуры застаецца па-за ўвагай падарожнікаў? Знаёмства з імі не ўключана ў папулярныя турыстычныя маршруты, самастойны вандроўнік можа і не заўважыць таблічку, рэдкі фатограф звяртаецца да іх адлюстравання, ды, як правіла, тыя здымкі застаюцца ў яго творчым багажы і рэдка дэманструюцца публіцы. Гаворка пра цудам уцалелыя пабудовы свецкага прызначэння і храмы, што знаходзяцца пад абаронай дзяржавы, пра закінутыя будынкі, лёсам якіх мала хто цікавіцца, пра былыя палацы, сядзібы, маёнткі, у сценах якіх жыццё працягваецца (там, напрыклад, можа дзейнічаць музей), пра цэрквы і касцёлы, дзе і сёння чакаюць вернікаў. Царква Усіх Святых у Бягомлі, Касцёл Святога Антонія ў Княжыцах, палацава-паркавы ансамбль Навіцкіх у Савейках, руіны Успенскай царквы ў Малых Шарыпах, сядзіба Халецкіх і Войніч-Сянажэцкіх у Хальчы, капліца-пахавальня Хамянтоўскіх у Равуччы — гэтыя і многія іншыя скарбы спадчыны сёння не на слыху, хоць, натуральна, не забытыя — вывучаюцца гісторыкамі, згадваюцца ў тэлеперадачах, выяўляюцца мастакамі. Не хапае ім выдатнага фатаграфічнага матэрыялу. Пры жаданні можна знайсці неблагія здымкі, што забяспечваецца выдатнымі тэхнічнымі магчымасцямі камеры. Аднак у большасці выпадкаў гэта выключна адлюстраванне рэчаіснасці. Аўтарскае бачанне, мастацкую ідэю знайсці значна складаней.

Выстаўка «Архітэктура скрозь стагоддзі» якраз знаёміць з мастацкай фатаграфіяй. Сярод аўтараў, творы якіх увайшлі ў экспазіцыю, — Валерый Вядрэнка. Мастак, фатограф і публіцыст працуе ва ўсіх жанрах фатаграфіі, аднак улюбёны — пейзаж. Эксперыментуе ў лічбавых мантажах, якія называе «фотапластыкай». Здымкі аўтара напоўнены метафарамі: недзе гэта толькі дэталь, а недзе — дамінанта ўсёй кампазіцыі. Нетрывіяльны падыход фатографа выяўляецца і ў выбары аб'ектаў для адлюстравання, абазначаных у назвах работ: «Мястэчка Зембін. Рэшткі касцёла» (2018), «Вёска Завушша. Рэшткі капліцы» (2022), «Вёска Губіна. Рэшткі касцёла» (2022), «Вёска Белая Царква. Рэшткі царквы» (2022). У адрозненне ад іншых аўтараў на выстаўцы, Валерый Вядрэнка прадставіў каляровыя, з яркімі элементамі, здымкі, у якіх чытаецца любоў не толькі да самых, здавалася б, даўно забытых крупінак спадчыны, але і да чалавека, маленькага і непрыкметнага, і некалі даўно, і сёння разгубленага перад веліччу зробленага папярэднікамі.

Яшчэ адзін удзельнік выстаўкі ў НЦСМ — Віталь Раковіч. Прэзентаваны работы, якія ўмоўна (ці не, гэта з выстаўкі не зусім зразумела) можна аднесці да адной серыі. Схіляюць да гэтага і падыходы, выбраныя аўтарам, кідаецца ў вочы агульны стыль, хоць кадры зроблены ў розныя гады. Перад гледачом — нібы састарэлыя фотаздымкі знакамітых архітэктурных помнікаў Беларусі. З аднаго боку, гэта дакументы, якія ўзнаўляюць стан будынкаў у пэўны перыяд, з улікам таго, што іх акружала ў хвіліну здымкі. З іншага — творы нагадваюць графіку з яе асаблівым стаўленнем прадмета да прасторы, з яе лініямі, штрыхамі і плямамі. Адлюстроўванне, бачанне Віталем Раковічам касцёла Святой Троіцы ў Глыбокім (фота 2010 года), касцёла Святой Троіцы ў Гервятах (фота зроблена ў 2011-м), палаца Пуслоўскіх у Косаве (2005 год), касцёла Святога Тадэвуша ў Вішневе (здымак 2012 года) і іншых знакавых мясцін — ужо таксама частка гісторыі.

Экспануюцца работы Вадзіма Качана, Наталлі Яўмененкі, Аляксандра Зазулі, Алены Данбровай, Сяргея Кулагіна. Гэтыя аўтары меней заклапочаны лёсам спадчыны — яны разважаюць пра існасць архітэктуры, яе сучасныя характарыстыкі. Апроч хіба Сяргея Кулагіна; трыпціх «Смаляны, Белы Ковель» (2003) распавядае пра разбураны замак, пабудаваны да 1626 года князем Сангушкам-Ковельскім на беразе ракі Дзярноўкі (Аршанскі раён). Ён быў моцна пашкоджаны падчас Паўночнай вайны ў 1708 годзе і канчаткова разбураны ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Сёння можна ўбачыць толькі руіны гранёнай пяціяруснай вежы, а таксама прылеглага да яе корпуса. Сяргей Кулагін з дапамогай пэўных кампазіцыйных рашэнняў імкнецца данесці думку аб прыгажосці і змрочнасці існавання на зямлі, нагадаць пра крохкасць жыцця.

Дарэчы, выстаўка «Архітэктура скрозь стагоддзі» на дзіва цэльная, хоць і не абмяжоўваецца сучасным поглядам на архітэктуру. Змешчаны здымкі, у тым ліку з Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, якія расказваюць пра Мінск сярэдзіны мінулага стагоддзя. Яны, здаецца, аніяк не «рыфмуюцца» з сённяшнімі кадрамі, гэта зусім іншая эстэтыка, адрозны погляд на жыццё. Дык жа і сталіца пад уплывам розных эпох не магла застацца аднастайнай, і колькі яе яшчэ чакае змен…

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Анатоль Каледа «Архітэктар Левін Леанід Мендзелевіч», 1986 г.

Работы Віталя Раковіча ў экспазіцыі.

*Аляксандр Зазуля «***».*

Магчымасць пазбавіцца кантэксту

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы размясцілася выстаўка фотаработ Сяргея Калтовіча (1961—2022) «Душою, сэрцам я між вас…». Майстар быў вядомы як фатограф, рэстаўратар, член беларускага саюза дызайнераў, удзельнік рэспубліканскіх і міжнародных праектаў. Сярод яго творчых дасягненняў — бронзавы медаль ВДНГ (СССР), прызы *International Federation of Photographic Art (FIAP)*: адзначаны сярэбраным медалём у Іране, бронзавымі — у Харватыі, Іспаніі, Францыі.

У музеі Янкі Купалы нагадваюць, што Сяргей Калтовіч як рэстаўратар і дызайнер выставачных і экспазіцыйных праектаў шмат супрацоўнічаў з беларускімі музеямі. Сярод іх — Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. Сябраваў і з Купалаўскім. Вядома, што дзякуючы яго намаганням была алічбавана значная частка твораў мастацтва ў зборы музея. У выніку ўдалося стварыць альбом-каталог «Я адплаціў народу, чым моц мая магла…», які ўбачыў свет у выдавецтве «Беларусь» у 2019 годзе. Выданне прэзентуе мастацкія работы з калекцыі літаратурнага музея Янкі Купалы, якія ствараліся мастакамі на працягу амаль 100 гадоў.

У экспазіцыю «Душою, сэрцам я між вас…» увайшлі 24 фатаграфіі з апошняга праекта мастака. Сяргей Калтовіч апроч іншага цікавіўся фактурай простых рэчаў, быў захоплены адлюстраваннем вобразаў штодзённасці. Сталовыя прыборы, імбрычкі, пустыя бутэлькі, нават мясарубка — сфера зацікаўленняў аўтара здольна здзівіць. Хоць, вядома, звяртаўся ён да любых прадметаў ужытку: абутак, гадзіннік, чамадан, камера, разнастайныя інструменты… Прытым здымкі аўтара нельга цалкам аднесці да прадметнай фатаграфіі. На карысць гэтага гавораць фрагментарнасць і дэталізацыя, пабудова кампазіцыі. Для творчасці Сяргея Калтовіча характэрны яркасць і кантраснасць. Яны адцягваюць увагу гледача ад гісторыі прадмета, якая, безумоўна, існуе, і прымушаюць пазбавіцца кантэксту, зірнуць на матэрыялы пад іншым ракурсам, адчуць тэкстуру.

Выстаўка у Купалаўскім музеі працуе да 31 кастрычніка.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

(Не)міфы пра жыццё акцёра

Час бязлітасна і адначасова справядліва ставіцца да ўсіх. Няма выключэнняў. Цяперашнія каштоўнасці, верагодна, пазбавяцца сваёй вагі праз некалькі гадоў. Знойдзецца нешта новае. І вось час прыўнёс свае карэктывы ў РТБД. Акцёрскі склад папоўніўся — значыць, нам застаецца спадзявацца, што тэатральны небасхіл хутка пакрыецца новымі зоркамі.

Мы пазнаёміліся з Юліяй Гружэўскай — маладой актрысай, якая прыйшла працаваць у Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі. Юлія з самага дзяцінства праяўляла сябе ў творчым кірунку: вучылася спяваць і танцаваць з 4 гадоў, набываючы адпаведныя навыкі, якія ў будучыні, як аказалася, спатрэбіліся ў акцёрскім жыцці. У 2017 годзе паступіла ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў на курс Мікалая Кірычэнкі па спецыяльнасці «Акцёр драматычнага тэатра і кіно». Аднак давучыцца ў майстра не атрымалася з-за смерці Мікалая Міхайлавіча. У 2019 годзе дзяўчына пераходзіць на курс Міхаіла Кавальчыка па спецыяльнасці «Акцёр музычнага тэатра». Так, вымушана змяняючы адценні сваёй будучай прафесіі (магчыма, гэта не проста так і ўсё лёсавызначальна), Юлія ў 2022 годзе закончыла акадэмію.

У акцёрскі склад РТБД Юлія трапіла, даведаўшыся з сацыяльнай сеткі Instagram аб пошуку артыстаў. Дзяўчына адразу адаптавалася да тэмпу тэатра і працягвае ў ім працаваць і сёння.

Цяпер актрыса задзейнічана ў наступных спектаклях: «Мудрамер» (сакратарка Нюра Мілашкіна), «Шлюб з ветрам» (госця), «Вось я і прыйшла» (Старая 3), «Сірожа» (Таня), а таксама ў чытках п'ес ад Цэнтра беларускай драматургіі.

Мы прапанавалі маладой актрысе пракаменціраваць дзесяць (не)міфаў з тэатральнага жыцця.

Міф 1: «Акцёр тэатра — прафесія не вельмі прыбытковая, вялікіх грошай тут не зарабіць».

— Вядома, праца ў тэатры не вельмі прыбытковая, але гэта зусім не спыняе творчых людзей, якія выбралі такі шлях добраахвотна, свядома. Тут не грошы ў прыярытэце, а душэўны стан, цяга: калі ёсць імкненне, то ўсё астатняе сыходзіць на другі план. Здаецца, як і ў любой справе, чалавеку важна прызнацца самому сабе, наколькі абраная прафесія аказалася правільнай, улічваючы практычны вопыт, «паднаготную» працэсу, які часцяком разбівае «завоблачныя» ўяўленні пачаткоўца.

У спектаклі «Вось я і прыйшла».

Міф 2: «Кветкі пасля спектакля не асабліва радуюць артыстаў, яны іх або некаму аддаюць, або выкідваюць».

— Ніколі не сутыкалася з падобным, таму адназначна — хлусня. Падораныя акцёру кветкі — гэта магчымасць гледача выказаць сваю падзяку, сімпатыю або захапленне ад таго, што ён убачыў, пачуў, адчуў. Як і кожнаму чалавеку, любому (не пабаюся гэтага слова) акцёру хочацца прызнання ці хаця б таго, каб яго працу ацанілі па заслугах. Вельмі прыемна атрымліваць кветкі, асабліва — ад незнаёмых, якія не ведаюць цябе і, адпаведна, шчыра, без прадузятасці, могуць прасякнуцца тваёй ігрой. Гэта вельмі прыемна!

Міф 3: «Калі артыст іграе веселуноў, ён і ў жыцці заўсёды радасны».

— Відавочна, гэта міф. Кожны чалавек няшчасны па-свойму. На мой погляд, аптымізм — гэта паказчык сілы, здольнасці хаваць свае перажыванні. Успомнім хаця б культавых савецкіх акцёраў, якія запомніліся нам у забаўляльных ролях. Георгій Віцын, Яўгеній Маргуноў, Фрунзік Мкртчан... За кожным з гэтых акцёраў хаваецца драма, магчыма, нават трагедыя, таму язык не павернецца пацвердзіць гэты міф. Усё індывідуальна, і я не адмаўляю, што такое магчыма, але гэта не больш чым удалая выпадковасць.

Міф 4: «Артыстам у адносінах лепш не давяраць, таму што яны могуць "сыграць" эмоцыі і пачуцці, якіх на самай справе няма».

— Мне здаецца, зусім няважна, акцёр ты ці не, каб сыграць уцягнутасць, калі такая рыса жыве ў табе. Сярод звычайных людзей ёсць верагоднасць сустрэць крывадушнасць, хлусню ў адносінах да сябе. Ад гэтага ніхто не застрахаваны. Таму гэты міф толькі часткова слушны, бо людзі (і тут гаворка нават не пра акцёраў) розныя. Нельга распаўсюджваць гэты выраз на ўсіх.

Юлія Гружэўская.

Міф 5: «Кожны акцёр марыць стаць рэжысёрам».

— Ведаю такіх артыстаў. І абсалютна ўпэўнена, што ў іх гэта атрымалася б вельмі добра. Павінна быць схільнасць да такога: трэба ўмець глыбока адчуваць жыццё, ўнікаць у яго працэсы. Гэта не кожны можа. Я ж бачу сябе больш у выкананні, чым стварэнні, таму катэгарычнасць міфа адназначна мае патрэбу ў змякчэнні (для пачатку выкрасліць слова «кожны»).

Міф 6: «У артыстаў ёсць свае забабоны і традыцыі».

— А вось гэта праўда! Прыводжу прыклад. Калі тэкст п'есы (усё роўна які) выпадкова падае з рук, то, наколькі б дзіўна гэта ні выглядала, трэба сесці на яго і падняцца разам з ім. Тады ўсё будзе добра. Такіх забабонаў шмат, як і традыцый. Распавяду яшчэ адзін рытуал перад пачаткам спектакля. У момант, калі вось-вось пачнецца пастаноўка, усе акцёры збіраюцца ў кола і злучаюць рукі ў цэнтры. У гэтым рытуале мае значэнне колькасць задзейнічаных. Умоўна — 12. І ўсе хорам пачынаюць лічыць да 12, пасля чаго кажуць «з Богам!» і жадаюць поспеху. Наколькі памятаю, усе спектаклі пасля гэтага ішлі на ўра. (У гэты момант Юлія тры разы сплюнула.)

Міф 7: «Самае страшнае для артыста — забыць тэкст на сцэне».

— Так, несумненна. Гэта — самы галоўны страх акцёра. У такія моманты (а яны здараюцца не так рэдка, як хацелася б) важна выкруціцца, зымправізаваць. Дарэчы, гэты навык вельмі важны для акцёра, можна сказаць, выратавальны круг. Складана ў такія моманты не паказаць, што нешта адбылося не так, як планавалася.

Міф 8: «Рэцэнзіі тэатральных крытыкаў артысты не чытаюць».

— Не пагаджуся. Бачыла, і неаднаразова, як калегі чытаюць матэрыялы крытыкаў, а таксама водгукі звычайных гледачоў. Гэта да пытання аб прызнанні: важна ведаць, што пра цябе і тваю працу думаюць людзі. Мы ствараем не для сябе, а для людзей, і, вядома, любое меркаванне нам важна. Асабліва — тэатральных крытыкаў. Яны як-ніяк дасведчаныя ў сцэнічнай справе, таму іх меркаванне шмат у чым вызначальнае.

Міф 9: «Рэдка бывае, што ў тэатры складваецца дружны калектыў».

— Гэта праўда, аднак мне з гэтым пашанцавала. Калектыў РТБД — вялікая, з'яднаная і прыязная каманда. Мяне калегі прынялі лёгка, без нейкай пыхі. І гэта ключавы элемент у адаптацыі: чым хутчэй ты адчуеш сябе камфортна, тым хутчэй зможаш сябе раскрыць і праявіць у поўнай ступені.

У спектаклі «Вось я і прыйшла».

Міф 10: «Калі гледачы шэпчуцца падчас спектакля або камусьці тэлефануюць, артыстаў гэта вельмі крыўдзіць».

— Гэта балючая тэма для акцёра. Такое бескультур'е кранае абсалютна кожнага, хто знаходзіцца ў гэты час ў зале. Памятаю, калі ішоў паказ «Мудрамера», адна жанчына ўстала і, як высветлілася пазней, адправілася піць каву. Хіба гэта варта таго, каб сваёй просьбай «Можна прайсці?» патурбаваць іншых гледачоў? Хіба варта было гэта закранутых пачуццяў акцёраў? У гэтыя моманты мы спрабуем не звяртаць увагі на такіх людзей, а працягваць натхняць сваёй ігрой усіх астатніх.

Антон АНТОНАЎ

Фота з сайта РТБД і асабістага архіва Юліі Гружэўскай

Французскі вадэвіль на беларускай сцэне

У гэтым годзе ўпершыню на беларускай сцэне выступіла трупа Казанскага акадэмічнага рускага Вялікага драматычнага тэатра імя В. І. Качалава. Яе гастролі прайшлі ў рамках Дзён культуры Рэспублікі Татарстан. Між тым гастролі працягваліся не тры дні, а два тыдні.

Качалаўскі тэатр прадставіў на сцэне Купалаўскага шэраг класічных спектакляў у сучаснай апрацоўцы. Гэта такія знакамітыя п'есы, як «Рэвізор», «Пікавая дама», «Скрыпач на даху» і іншыя. Кожны з іх заслугоўвае ўвагі, але хацелася б спыніцца на камедыі-вадэвілі ад рэжысёра Аляксандра Славуцкага «Пыл у вочы». Французская камедыя Эжэна Лабіша расказвае пра дзве звычайныя сям'і XIX стагоддзя. У цэнтры п'есы — вельмі распаўсюджаная праблема таго часу — крывадушнасць. Кожны імкнецца выглядаць лепш, чым ён ёсць на самай справе, нават калі для гэтага трэба хлусіць і ахвяраваць шчасцем сваіх дзяцей. Яркі гумар робіць пастаноўку лёгкай і вясёлай, але гэта не перашкаджае адчуць усю сур'ёзнасць выказанага аўтарам.

Вадэвіль часцей за ўсё суправаджаецца танцамі і спевамі. Музыка Сержа Генсбура паміж сабой часткі сюжэта, але працягвае чырвоную нітку паміж гледачамі і акцёрамі.

Сцэна са спектакля «Пікавая дама».

Асобнай увагі заслугоўваюць выканаўцы роляў маці — мадам Маленжар і мадам Рацінуа. Яркія жаночыя персанажы, якіх увасобілі на сцэне Антаніна Іванова і Алена Галіцкая, вядуць лінейны аповед крок за крокам. Іх талент, якім натхняюцца і астатнія акцёры, пакідае незабыўнае ўражанне.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА

Вясковы лірнік беларускага народа

Важную ролю ў аднаўленні беларускамоўнай літаратуры адыграў вядомы паэт, краязнаўца, публіцыст, крытык, перакладчык і этнограф Уладзіслаў Сыракомля (сапраўднае імя — Людвік Францішак Уладзіслаў Аляксандравіч Кандратóвіч, 29 верасня 1823 — 15 верасня 1862).

«Літоўскім лірнікам», «літоўскім паэтам», «песняром Літвы» называлі яго ў друку нават яшчэ пры жыцці, бо ў XIX стагоддзі ён быў вельмі папулярны на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Літвой для Сыракомлі і яго сучаснікаў была Беларусь, гэта добра разумелі праз 50 гадоў пасля яго смерці і польскія аўтары. Чэслаў Янкоўскі ў сваім артыкуле «Літва Сыракомлі» пісаў, што калі б Сыракомля ўстаў з магілы, то ён «аказаўся б не на Літве, а на Беларусі, дзе ўбачыў Кандратовіч святло, дзе пражыў свой век паміж Залучам і Барэйкаўшчынай».

Уладзіслаў Сыракомля нарадзіўся ў небагатай шляхецкай сям'і роду Кандратовічаў герба «Сыракомля» — ад выразу «сыры камель», — якая займалася сельскай гаспадаркай у арандаваных фальварках. Паводле каталіцкай традыцыі быў названы трыма імёнамі — Людвік Францішак Уладзіслаў. Яго продкі належалі да старадаўняй апалячанай беларускай шляхты.

Бацькі Уладзіслава Сыракомлі — Аляксандр Кандратовіч і Вікторыя Златкоўская (Кандратовіч).

Бацька Кандратовіча вымушаны быў арандаваць панскую зямлю, кожны раз пераязджаў на новае месца. Калі Людвіку не было яшчэ трох гадоў, сям'я ўжо арандавала новы фальварак — Яськавічы Слуцкага павета, на беразе ракі Морач. У сваім дзённіку пазней Сыракомля пісаў: «Першая мясціна, якую памятаю, гэта Яськавічы… Яшчэ перад маімі вачыма, дакладней, ва ўяўленні стаіць, як мы аднойчы доўга-доўга плылі на чоўне між чароту і лазы — пад намі быў залацісты пясочак, а побач ляталі ясна-зялёныя стракозы».

Ужо ў шэсць гадоў Людвік чытаў творы Ф. Князьніна і І. Красіцкага, з бацькам вучыў лацінскую граматыку. Праз шэсць гадоў сям'я зноў была вымушана пераехаць на новае месца. Вясной 1831 года яны арандавалі дом у Кудзінавічах (цяпер вёска ў Капыльскім раёне). Як пазней згадваў паэт, менавіта тут, каля сажалкі побач з домам, калі з'яўлялася жаданне пабыць аднаму, ён выпраўляўся ў падарожжы па свеце ўяўленняў. Разам з сялянскімі дзецьмі даводзілася ездзіць на начлег, там ён і слухаў народныя песні ды мясцовыя легенды.

Ужо падчас першых летніх вакацый (1834 г.) сям'я зноў пераехала, гэтым разам у Мархачоўшчыну (цяпер вёска ў Стаўбцоўскім раёне), пад Новы Свержань.

Поспехі ў вучобе былі адметныя, але не давялося скончыць Людвіку школу, бо яе закрылі ў 1835 годзе. Чацвёрты і пяты класы ён закончыў у Навагрудку. Пасля вярнуўся да бацькі і дапамагаў па гаспадарцы, але, як сам паэт пісаў у сваім дзённіку, яго цягнула да пяра і кніг, найбольш любіў Адама Міцкевіча і Вальтэра Скота.

Адам Шэмеш. «Партрэт Уладзіслава Сыракомлі».

У 1840 годзе сям'я перабралася ў Залуча (у межах цяперашняга Стаўбцоўскага раёна) побач з Нёманам і менш значнымі рэкамі Ячонкай і Сулай. Менавіта на гэтай неўрадлівай, але дарагой сэрцу зямлі і пражыў паэт пазней шмат часу.

У 1841 годзе па хадатайніцтве бацькі Людвік уладкаваўся на службу ў канцылярыю кіраўніцтва радзівілаўскімі маёнткамі ў Нясвіжы. У вольны час занатоўваў у дзённіку мясцовыя паданні, апавяданні пра мінулае Нясвіжа і яго гаспадароў, якія «свае імёны то золатам, то крывёю запісалі ў памяць народа». Нясвіж тады быў глухім мястэчкам, якое засталося пасля гучнай славы Радзівілаў. Кандратовічу расказалі шмат легенд пра нястрымныя забавы і нечалавечыя ўчынкі магнатаў. Менавіта гэтыя аповеды з часам склаліся ў паэтычныя радкі, дзе раскрываецца панская пыха і выносіцца прысуд жорсткасці.

16 красавіка 1844 года ў Фарным касцёле Людвік Кандратовіч абвянчаўся з пляменніцай Дабравольскага Паўлінай Мітрашэўскай.

Нясвіж для Людвіка Кандратовіча стаў лёсавызначальным горадам, праз усё жыццё ён успамінаў горад юнацтва і не раз звяртаўся да гісторыі радзівілаўскай рэзідэнцыі ў сваёй творчасці.

Праз некалькі дзён яны пераехалі ў Залуча, каб распачаць супольную гаспадарку, а бацькі Кандратовіча з дочкамі выправіліся абжываць суседні фальварак Тулёнка, які яны яшчэ ў 1840 годзе ўзялі ў арэнду.

Сам Кандратовіч зрабіў замалёўку свайго фальварку ў Залучы, які захаваўся да нашых дзён. Ён ахвотна займаўся не толькі гаспадаркай, але і паэзіяй, пісаў краязнаўчыя нарысы: «Залучанская ваколіца цудоўная для звыклага з ёй вока, але пустынная для чужынца, у якога няма ўспамінаў, звязаных з гэтай мясцінай, які не мае ніякага ўяўлення пра асаблівасці спеву тутэйшых салаўёў, пра пошум тутэйшага ветру».

Гэтыя біяграфічныя звесткі сведчаць пра грунтоўнае знаёмства паэта з бытам сялян Мінскай губерні ў яе розных мясцовасцях, дзе і прайшло дзяцінства, юнацтва і частка сталых гадоў паэта.

Доўга і плённа Сыракомля ў Залучы займаўся творчасцю. За той час напісаў гутаркі «Шляхціц Ян Дубарог», «Хадыка», «Паштальён» і шмат вершаў: «Лірнік вясковы», «Немаўляці», «Гутарка пра бусла. У дадатак ён перакладаў польскіх паэтаў XVI—XVII стагоддзяў, якія пісалі на латыні. Складаў у тыя часы яшчэ «Гісторыю літаратуры ў Польшчы» (у двух тамах). У лісце да Адама Плуга расказваў: «Ці паверыш, што ў Залучы я прагну паветра і сонца — так сплываюць мае дні між стосаў паперы ў цёмнай хаце».

Па выдавецкіх справах 3—4 разы на год ездзіў у Вільню. Да друку рыхтаваліся яго пераклады Іахіма Бельскага, Яна Каханоўскага, Мацея Казімежа Сарбеўскага, Клеменса Яніцкага, Себасцьяна Кляновіча, а таксама двухтомная праца «Гісторыя літаратуры ў Польшчы».

Пазней выдавецкія справы і нялад гаспадаркі вымусілі Кандратовіча пераехаць у Вільню на сталае месца жыхарства. На гэта паўплывала і няшчасце ў сям'і: за тыдзень памерлі тры яго малыя дачкі — Фабіянка, Марына і Вікця.

У Вільні паэт пасяліўся спачатку ў доме Мілера (сваяк Станіслава Манюшкі) на вуліцы Нямецкай, а потым, калі прыехаў Каратынскі з Залуча, пераехалі ў дом Доўнара ў Абрамовіцкім завулку.

Сэрца «вясковага лірніка» патрабавала спакою, таму праз некаторы час у канцы красавіка 1853 года ён пераехаў з сям'ёй у арандаваны фальварак Барэйкаўшчына, што знаходзіўся між Вільняй і Ашмянамі. З таго часу ў творчасці з'яўляюцца матывы суму па родных мясцінах, пошуку свабоды. Апошняя арандаваная сядзіба за 10 гадоў так і не стала роднай сэрцу паэта, бо пісаў:

Тут не мае ні дом, ні глеба,
Што родзіць хлеба небагата.
Мае тут толькі сонеч неба,
Якая ўзносіцца над хатай.

Пераклад У. Дубоўкі.

Асобна варта адзначыць гісторыка-краязнаўчую кнігу «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах». Менавіта яна з'яўлялася для Сыракомлі той крыніцай, якая сунімала настальгію па мясцінах маладосці (Нясвіж, Мір, Койданаў, Стоўбцы).

Як працяг вандровак было задумана напісаць нарыс «Мінск», ён нават быў надрукаваны ў 1854 годзе ў «*Gazecie Warszawskiej*», а ў 1857-м у «*Tece Wileńskiej*», і ў наступныя гады ён усё працягваў назапашваць матэрыял пра сталіцу свайго краю.

У кастрычніку 1856 года Сыракомля выехаў з Барэйкаўшчыны ў Варшаву (праз Мінск, Слуцк, Брэст). Па дарозе вёў дзённік, запісваў свае ўражанні, пабудовы (некаторыя замалёўваў), якія бачыў, выгляд сялян і асаблівасці іх мовы, геаграфічныя адрозненні паселішчаў (Меднікі, Дзявятні, Каменны Лог, Ашмяны, Жупраны), але нататкі скончыліся на Смаргоні («мястэчка старой акадэміі мядзведзяў, сталіца вядомых па ўсёй Літве абаранкаў»).

нарысы («Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», «Манаграфія ракі Нёман», «Мінск»), а таксама ўступ да задуманай аповесці-мемуару «Вёска», якія і былі напісаны пад уражаннем успамінаў.

«Заўсёды мне здавалася, — пісаў У. Сыракомля, — што нельга палюбіць Маці-зямлю родную без уважлівага вывучэння ўсяго яе аблічча. Навучыцца бачыць іскру, што ўпала з яе павек, плакаць яе слязьмі, якія з вачэй яе цяклі або цячы маглі, нават з любасцю лічыць маршчыны на яе твары — усё гэта абавязковыя ўмовы любові. Даследаваць нашу родную зямлю ў гістарычных, прыродных, этнаграфічных, археалагічных, геаграфічных адносінах — гэта, здаецца, вельмі просты вынік таго, што прынята называць любасцю да радзімы». Сувязь чалавека з радзімай, на думку паэта, з'яўляецца праяўленнем яго высокай духоўнасці. Акрамя літаратуры, ён займаўся і археалагічнай працай, што было адзначана пасля Адамам Кіркорам.

Памёр 15 верасня 1862 года ў Вільні ў доме па цяперашняй вуліцы Барбары Радвілайтэс. Пахаваны на могілках Роса ў Вільні.

На двухпавярховым доме ў Вільні, дзе памёр паэт, над варотамі вісіць мемарыяльная табліца на польскай мове. У касцёле Святых Іаанаў каля паўночнай сцяны ў 1908 годзе быў адкрыты помнік Уладзіславу Сыракомлю з бронзавым бюстам па праекце скульптара Піюса Вялёнскага, выкананы Пятрасам Рымшам. Імя Сыракомлі носіць вуліца ў Вільні.

Такім чынам, мы можам заўважыць, што падарожжы Сыракомлі па тэрыторыі тагачаснай Літвы і мясціны жыцця пісьменніка непасрэдна паўплывалі на станаўленне творчай асобы і фарміраванне праблемна-тэматычнага кола яго творчасці. Згодна з біяграфічнымі звесткамі, паэт меў магчымасць грунтоўна пазнаёміцца з жыццём беларускага народа. Асабліва добра ён

Сядзіба арандатара ў фальварку Залуча. Ёй паэт прысвяціў верш «Пра маю старую хатку». Тут былі напісаны гавэнды «Шляхціц Ян Дубарог», «Хадыка», верш «Лірнік вясковы», «Прысвячэнне ліцвінам народных гутарак», «Немаўляці», «Гутарка пра бусла» і інш. Рэпрадукцыя з малюнка У. Сыракомлі.

У Варшаве ён прабыў амаль месяц, прадставіў дзве п'есы — «Хатка ў лесе» і камедыя «Граф на Ванторах». З сустрэч з выдаўцамі, журналістамі, акцёрамі і літаратарамі даведаўся, што тут яго творчасць ведаюць не менш, чым на радзіме, але ўспрымаюць не так палымяна. Праз шырокую папулярнасць Сыракомлю запрашалі на розныя прыёмы, вялі перагаворы аб супрацоўніцтве, а таксама прапаноўвалі стаць рэдактарам «*Gazety Codziennej*», што азначала б пераезд у Варшаву на сталае месца жыхарства, але сум па радзіме не адпусціў паэта.

Творчым увасабленнем любові да роднага краю з'яўляюцца яго краязнаўчыя

ведаў быт сялян Мінскай губерні, дзе прайшла большая частка яго жыцця, і Віленскай, дзе правёў апошнія гады жыцця.

Калі паэт апісваў багатую, самабытную беларускую прыроду і ваколіцы, падкрэсліваў высокія чалавечыя якасці простага народа. Яго творчасць значна паўплывала на грамадскую думку беларусаў, а сёння па творах Уладзіслава Сыракомлі можна вывучаць жыццё яго эпохі.

Ганна ЛЯВОНЕНКА,
аспірант Інстытута літаратуразнаўства імя Я. Купалы
Фота даслана аўтарам

Бярозка на літаратурным узлеску

Многіх беларускіх паэтаў і празаікаў напаткаў трагічны лёс, жыцці некаторых забралі непрадбачаныя жыццёвыя абставіны, сярод іх — хваробы, а то і трагічны выпадак. Забраў ён і паэта Леаніда Якубовіча. Раніцай 1970 года, як заўсёды, ён спяшаўся на работу. Першая змена пачыналася ў шэсць гадзін. У шахту спускаўся адзін. Як неаднойчы да гэтага. Здавалася, нішто бяды не прадвяшчала. Але нечакана трос, на якім трымалася келля з ім, абарваўся. Раніца 8 чэрвеня 1970 года стала апошнім днём жыцця дваццацідвухгадовага юнака (нарадзіўся 31 сакавіка 1948 года ў вёсцы Радкава цяперашняга Салігорскага раёна):

Нараджаемся не да смерці,
Нараджаемся мы, каб жыць,
Ды страла нацэлена ў сэрца,
Праз вякі ўжо страла ляціць.

Візітоўка яго часу

Ніне Мацяш, якая лічыла яго сваім «блізкім другам», ён запомніўся «высокім хударлявым юнаком з летуценна-засяроджаным позіркам». Такім застаўся ён і на нямногіх здымках, што паспелі ўжо крыху пажоўкнуць ад часу. Такім памятаюць яго і тыя з сяброў, каму даводзілася сустракацца з ім, калі быў студэнтам-завочнікам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Удзельнічаў ён і ў адным з традыцыйных семінараў творчай моладзі, што праводзіўся Саюзам пісьменнікаў Беларусі ў Каралішчавічах.

Друкавацца пачаў рана. І не толькі ў салігорскай газеце «Шахцёр». 23 верасня 1965 года з вершам «Раніца» выступіў у «Чырвонай змене». Праз год два вершы з'явіліся ў 12 нумары «Голаса Радзімы». Працаваў у рэдакцыі газеты «Шахцёр», потым перайшоў на Салігоркі камбінат. Друкаваўся і ў іншых газетах, часопісе «Маладосць». Пасля смерці творы ўжо былі прадстаўлены ў калектыўных зборніках «Рунь» (1970) і «Універсітэт паэтычны» (1971).

Узіраюся ў яго здымак, змешчаны ў адзіным пажыццёвым зборніку «Я з вамі, вёсны…», рупна складзеным сябрамі паэта і выпушчаным у 1979 годзе выдавецтвам «Юнацтва»: сапраўды, «высокі хударлявы юнак з летуценна-засяроджаным позіркам…» Але чым больш узіраюся, тым больш адчуваю ў гэтай летуценнай засяроджанасці нейкую не надта прыхаваную павалоку тугі. Каторы раз думаецца: каб жа толькі на той самай шахце больш — без тэхнічнага тэрміна тут ніяк не абысціся — дбалі аб тэхніцы бяспекі, аб элементарным захаванні ўмоў яе… Каб жа дбалі…

На жаль, нікому не дадзена не толькі права, але і магчымасць вярнуць час назад. Хіба што дзякуючы творам самога паэта, напісаным у гады маладосці, тым больш, калі маладосць гэтая стала для яго вечнай. Яны пачынаюць успрымацца своеасаблівай візітнай карткай гадоў, калі іх выношвалі ў задумах, клалі на паперу.

Хлеб, на слязах замешаны

Гады яго юнацтва, якія цяпер многімі згадваюцца як застойны перыяд, для яго, хлопца, народжанага пасля вайны, сталі магчымасцю вызначыць месца ў жыцці, зрабіць першую спробу асэнсавання пройдзеных дарог. Сяму-таму з сённяшніх маладых аўтараў, якія прывыклі, як і іх аднагодкі некалькі дзясяткаў гадоў назад, брацца за чубкі са старымі пісьменнікамі, адмаўляць ледзь не ўсю літаратуру, створаную не імі, наступныя радкі Леаніда Якубовіча ў лепшым выпадку могуць здацца дэкларацыйнымі:

Леанід Якубовіч.

Падтэкст не шукайце,
дарэмная праца,
Тут тэкст і падтэкст,
як адзіны граніт:
Пакуль у грудзях будзе стук адчувацца,
Я — сын нашай партыі,
я — барацьбіт.

Маўляў, залішне прамалінейна, голая публіцыстычнасць. Толькі не трэба спяшацца асуджаць яго. Ён так і жыў — у нечым празмерна задзірысты, у чымсьці зашмат эмацыянальны. Аднак жыў, а не існаваў, спяшаючыся зрабіць тое, што за яго ніхто іншы зрабіць не мог. Не толькі ў паэзіі, але ў жыцці штодзённым. «Пасля яго, — як піша Ніна Мацяш у прадмове «Імклівая мелодыя крыл», да ўжо згаданага зборніка «Я з вамі, вёсны…», — засталася новая — пад старой бярозай — хата, пабудаваная і яго рукамі. Застаўся малады сад, пасаджаны ім пад вокнамі гэтай хаты…»

Да працы ён прывык змалку, бо быў перакананы, што яна — гэта само жыццё. Праца так патрэбна была яму ў пасляваенную сіроцкую нішчымніцу. Пра сваё маленства і маленства аднагодкаў — адзін з найлепшых вершаў «Успамін»:

Хлеб у хаце!..
Пахучым сонцам
Цёплы бохан на покуці свеціць…
Мы сягоння рады бясконца,
Мы сягоння — райскія дзеці.

Радасць, як кажуць, праз край. Ды толькі «ў маці маршчын не меншае, // А ў маці скрозь смех слязінкі, // Бо апошняя радасць першая, // Бо няма ні адной мучынкі. // Толькі добры жнівень замесіць // З ураджаю новага радасць, // А да жніўня нягод завеса, // А да жніўня яшчэ хмары з градам». Толькі хіба звяртаеш на гэта ўвагу, калі ты ў такім узросце, што нават звычайны выпадак можа ўсцешыць душу. А тут жа — хлеб на стале! Яго Вялікасць Хлеб!

Мелодыя крыл

Да паэзіі, засяроджанай на радасцях і болі жыцця, як і кожны ў яго ўзросце, ішоў паступова, пераадольваючы тое неабавязковае, знешне правільнае, але ўжо выказанае іншымі, што ў юным узросце падаецца ледзь не адкрыццём, а на самай справе ўяўляе звычайную літаратурную рэмінісцэнцыю: «Пад сто дажджоў грыбных папасці // І нейкай раніцай туманнай // Прыйсці к табе і піць прычасце — // Ваду з крыніц тваіх крыштальных. // А потым з промнем самым першым // Ісці і слухаць кожнай клеткай, // Як прарастаюць з сэрца вершы — // Майго зямнога шчасця сведкі».

У вершы «Вяртанне», прыведзеным вышэй цалкам, душа лірычнага героя пакуль што не самавыяўляецца так, каб можна было ўбачыць яго як асобу, адчуць яе непаўторнасць. Але ёсць у Леаніда Якубовіча іншы верш, які захаваўся ў яго лістах. У ім пра гэтае «прарастанне з сэрца вершаў» сказана на дзіва проста і разам з тым па-свойму непадробна:

Аднойчы да чалавека прыйшло
свята…
Аднойчы пачуў ён
Імклівую мелодыю крыл,
Светлыя гукі сонечных промняў,
Велічныя акорды лесу, —
Аднойчы спасціг чалавек музыку…

Музыку ў самым шырокім сэнсе гэтага слова. Найперш музыку як паэзію жыцця. Гэтае спасціжэнне і адбываецца ў яго вершах. Ён знаходзіўся ў пастаянным пошуку, нястрымным жаданні спазнаваць нават спазнанае іншымі, каб выказаць сваё, іншымі не сказанае.

Аднак «шчаслівыя вершы» пісаліся не так часта, як таго хацелася б. «Як мала я пішу! Аж страшна… І ўсё гэта нявыкрутка з часам», — прызнаваўся блізкаму чалавеку. І правіў, правіў, робячы накід за накідам, варыянт за варыянтам. Як адбываўся гэты пошук адзіна магчымага слова, як удасканальвалася задума, выкрышталізоўвалася думка, кладучыся ў рэчышча найбольш плённага мастакоўскага адкрыцця, у пэўнай меры відаць з верша «Птушкі».

У першым варыянце: «А ім ляцець праз далі і трывогі // (узмах крыл — адвечная туга), // Павіс, як сум, іх вырай над дарогай, // Якую ўкрые снежная туга». Другі варыянт такі: «Да смерці, да знямогі // Жыццё нясці праз снежны ўраган». Тым самым узмацняецца і завяршэнне твора, набывае большую роздумную накіраванасць аўтарская думка.

Месяц у чаканні вяселля

Спроба заглыблення ў сутнасць жыццёвых з'яў часам прыводзіла да вершаў лаканічных, калі ў некалькіх радках удавалася выказаць думку, па-свойму афарыстычную, як, скажам, у «Наказе»: «Не патрывожце неасцярожнасці рухам// Дзіцяці шчаслівыя рукі, // Якія абдымаюць сноў васільковае воблачка, — // Гэта лепшы сны чалавецтва». Найчасцей жа сустракаліся адкрыцці, няхай і не такія ўжо вялікія, з няўменнем адысці ад звыклых выразаў. Толькі хіба можна сёння строга судзіць Леаніда Якубовіча за гэта?! Хіба можна забыць, што перад намі паэт, які толькі ступіў на нялёгкую літаратурную дарогу, шукаў свой бальшак і ў шуканні гэтым, здаралася, трапляў на сцежкі. Але сцежкі не тыя, што хістаюцца пад нагамі, на трывалы грунт.

Традыцыйнасць матываў у творчасці Леаніда Якубовіча не адмаўляе свежасці паэтычнага ўспрымання рэчаіснасці, калі аўтар умее быць назіральным, дапытлівым і адначасова крыху па-дзіцячы наіўным. Наіўным у добрым сэнсе слова — значыць, больш адкрытым, непасрэдным, даверлівым.

Ён яшчэ мог дазволіць сабе напісаць агульнае, тое, што ні да чаго не абавязвае: «Чысціню пачуццяў зберагу». Ды толькі ў вершы «Я з твайго, каханая, палону…» на гэта не звяртаеш увагі, бо поруч сапраўдная паэзія — пачуццяў, думак, поглядаў:

Ноч паслала нам даўно пасцелі.
І забыта даўняе: «Бывай!»
Месяц выплыў, быццам на вяселлі
Цёплы і пахучы каравай.

Леаніду Якубовічу больш падабаліся радкі пяшчотна-пранікнёныя, сонечна-прасветленыя, таму што ён быў лірыкам па складзе свайго таленту. Запамінаюцца тыя вобразы, што народжаныя нязмушана, быццам падгледжаны з самога жыцця. Як у вершы «Бліскавіцы грознай навальніцы…»:

Травы захлынаюцца ад росаў —
Помачы няма адкуль чакаць,
Ці то дождж, ці то дзяўчыны косы, —
Сцежкі пад нагамі не відаць.

Не ведаю, як каму, а мне чуецца пошум дажджу, бачацца кінжалы маланак, што раз-пораз пранізваюць цёмную павалоку неба — цёмную, хоць пра гэта ў вершы ні слова, але ж цёмную, бо «сцежкі пад нагамі не відаць»! І двое закаханых, закаханых да самазабыцця на лузе! Такое мог напісаць толькі паэт. Падобныя вершы адразу не нараджаюцца, яны спакваля ўзнікаюць у глыбінях душы, каб потым нечакана — гэтаксама, як гэты навальнічны дождж, — выліцца словамі прачулымі і сардэчнымі.

З радзімай назаўжды

Традыцыйнасць матываў у творчасці Леаніда Якубовіча не адмаўляе свежасці паэтычнага ўспрымання рэчаіснасці, калі аўтар умее быць назіральным, дапытлівым і адначасова крыху па-дзіцячы наіўным. Наіўным у добрым сэнсе слова — значыць, больш адкрытым, непасрэдным, даверлівым. Як у гэтым вершы:

Ну і раніца — уся з'інелая!
Па калені загрузла ў снег:
І застыла снягуркаю белаю
У чароўным і дзіўным сне.

І, вядома, самыя лепшыя радкі Леанід Якубовіч прысвячаў роднай Беларусі, якую да «самазабыцця любіў» (Ніна Мацяш):

О Беларусь! Старонка дарагая,
Мне без цябе — як дрэву без вады…
Хоць непрыкметнай птушкай
твайго гаю, —
Абы з табой… Навекі, назаўжды!

«Жыта заўжды жнуць тады, калі яно добра выспее; калі зярняты, здаецца, звоняць пад жнівеньскім ветрыкам. Так павінна быць і ў пісьменнікаў: бярыся за пяро толькі тады, калі адчуеш, што ўжо ўсё выспела ў душы для новага твора — так і звоніць добрымі вобразамі, добрымі думкамі», — у гэтым яго празаічным накідзе адначасова і творчае крэда. Разуменне нялёгкай пісьменніцкай працы, сэнс якой бачыў у тым, каб служыць — у дачыненні да лёсу Леаніда Якубовіча гэтыя словы набываюць глыбокі сэнс — свайму народу, Радзіме.

Цяжка прадугадаць, як склаўся б далейшы лёс паэта. У адным няма сумнення, што ён паступова б выходзіў на новыя рубяжы ў асэнсаванні рэчаіснасці. Так меркаваць падставу даюць асобныя з твораў, у якіх праглядваецца, бы зернейка, задума, выклёўваецца жаданне ўзнімаць пласты дня сённяшняга і гісторыі, якія патрабуюць да сябе ўважлівага стаўлення. Водгулле трывог часу знаходзім у вершах «Час вылечвае сэрца раны…», «Мне лес здаецца ветэранам…», «Кроў, кажуць, не дыміцца… » і іншых. У апошнім — усведамленне адказнасці, якая легла на плечы пасляваеннага пакалення.

* * *

Ён мала пражыў, але для свайго ўзросту для паэзіі зрабіў шмат. Узіраюся ў партрэт юнака. Быццам чую голас яго самога: «Я з вамі, вёсны, вам я свой!» І разумею, што яго паэзія вечна квітнее маладзенькай бярозкай на літаратурным узлеску.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Маляўнічым штрыхом

Вышэйшыя сілы не памыляюцца

Артур Шапенгаўэр і Фрыдрых Ніцшэ, Людвіг Ван Бетховен і Сяргей Пракоф'еў, Міхаіл Урубель і Эндзі Уорхал, Крышціяну Раналду і Сяргей Галіцкі — здаецца, хаатычны, нічым не звязаны пералік асоб, якія праславіліся ў свой час на розных нівах. Але ўсе яны, ды многія іншыя, сталі героямі партрэтаў сучаснага авангардыста Уладзіміра Акулава. Убачыць работы аўтара сёння можна на выстаўцы ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна.

Экспазіцыя «Партрэты выдатных людзей» раскрывае толькі адзін з бакоў таленту Уладзіміра Акулава, аўтара даволі неардынарнага, у пэўным сэнсе нелюдзімага, шмат у чым загадкавага. Аднак творчы метад, якім валодае мастак, прыкметны ў любой яго рабоце. Гратэск, што выяўляецца ў скажэнні форм, колеравых кантрастах, энергіі лініі, — адна з асноўных характарыстык яго жывапісу і графікі. Здаецца нават, што карціны Уладзіміра Акулава створаны пад уплывам імпульсу, падтрыманага ўнутраным імкненнем да хаосу. Але ж нельга назваць творы аўтара бязладнымі ці сумбурнымі: у іх, у любым выпадку, вельмі шмат гармоніі і стройнасці.



«Аўтапартрэт», 2022 г.

Лічыцца, што на падыходы мастака паўплываў еўрапейскі авангард першай чвэрці XX стагоддзя. Да таго ж вучыўся ён у Віцебску, дзе эксперыментам аўтара не перашкаджалі, не імкнуліся перайначыць яго натуру. І той час, і, так бы мовіць, ленінградскі перыяд, і пазнейшыя падарожніцтвы, і няспыннае самаразвіццё не падштурхнулі і не прымусілі Уладзіміра Акулава адмовіцца ад выбранага шляху. Ён перакананы ў яго правільнасці — іначай і немагчыма, бо не працаваў бы тады ў самых надзвычайных умовах. Іншая справа — ці гатовы да сузірання яго твораў сучасны глядач. Ці блізкія яму творчыя падыходы майстра? Ці разумее ён, якія традыцыі працягвае выхадзец віцебскай школы? Ці здольны спасцігнуць яго духоўны свет? Мастацтвазнаўцы сцвярджаюць: беларуская публіка сёння адукаваная і ўважлівая да сапраўднага таленту. Гэта тычыцца і набыцця твораў мастацтва. Напрыклад, карціны Уладзіміра Акулава, вядома, нядрэнна купляюцца.



«Поль Сезан», 2010 г.

Выстаўка «Партрэты выдатных людзей» дэманструе тое, як творца ўмее адлюстраваць характар, стан чалавека ў пэўны перыяд у партрэце. Недзе адлюстраваны думкі і пакуты героя, у некаторых выпадках прыкметныя іх унутраны боль і жыццёвая драма, часам відавочныя радасць і натхненне. Аднак немагчыма не заўважыць, што, нягледзячы на жыццёвы шлях таго ці іншага чалавека, Уладзімір Акулаў пазірае на яго з добрай усмешкай. Паўсюль — увага да кожнага лёсу і вера ў вышэйшыя сілы, якія не памыляюцца.

Для тых, хто цікавіцца авангардам і асобай Уладзіміра Акулава, ёсць дадатковая задача — да 15 кастрычніка ўбачыць выстаўку аўтара ў зале «Амфітэатр» мастацкай галерэі «Арт-Фабрыка». Там прэзентуюцца выбраныя творы — нацюрморты, партрэты, пейзажы. Куратарам абодвух праектаў выступае Яўген Ксяневіч, калекцыянер і сябар мастака, які папулярызуе яго творчасць. Яўген Ксяневіч упэўнены, што наш сучаснік Уладзімір Акулаў — геній, які заслугоўвае сусветнай вядомасці.



«Ле Карбюзье», 2010 г.

«Фрыдрых Ніцшэ», 2018 г.

Яўгенія ШЫЦЬКА

зваротная сувязь

А Муза-восень не драмала

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя перадачы.

У выхадныя — праект Навума Гальпяровіча «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты» і публіцыстычная перадача Настассі Ермалюк «Свет мастацкага слова» — сустрэча з сучаснымі пісьменнікамі, якія раскрываюць сваю творчую «кухню».

У нядзелю і панядзелак — радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча: гэтым разам — сустрэча з лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі Алінай Сабуць.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з навінкамі беларускіх выдавецтваў.

У праграме «Літаратурная анталогія» па буднях старонкі рамана Дафны Дзюмар'е «Рэбэка». У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы — «Зялёны лісток на планеце Зямля» Янкі Сіпакова. Па суботах выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі» з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» — вершы Уладзіміра Скарынкіна (чытае Алег Вінярскі).

У перадачы «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у выхадныя — спектакль «Страсці па Аўдзею» паводле п'есы Уладзіміра Бутрамеева.

Для юных прыхільнікаў мастацкага вяшчання ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — казка Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для самых маленькіх.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

8 кастрычніка — 85 гадоў з дня нараджэння Міхася Казакова (Міхаіла Аўрамавіча, 1938—2000), беларускага паэта, перакладчыка.

8 кастрычніка 70-гадовы юбілей святкуе Леанід Радзевіч (1953), беларускі графік, акварэліст, жывапісец.

8 кастрычніка 75-годдзе адзначае Таццяна Шамякіна (1948), беларускі літаратуразнаўца, крытык, перакладчык.

11 кастрычніка — 110 гадоў з дня нараджэння Эдзі Агняцвет (Каган Эдзі Сямёнаўны; 1913—2000), беларускай паэтэсы.

11 кастрычніка 45 гадоў з дня стварэння (1978) Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка «Ляўкі», філіяла Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

13 кастрычніка — 135 гадоў з дня нараджэння Язэпа Драздовіча (1888—1954), беларускага мастака, скульптара, этнографа, фалькларыста, археолага, пісьменніка.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

6 кастрычніка — ва Упраўленне судовых экспертыз па г. Мінску на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міхасём Пазняковым (вул. Фабрыцыуса, 12). Пачатак у 11.00.

7 кастрычніка — у Цэнтральную мінскую гарадскую бібліятэку імя Я. Купалы (вул. В. Харужай, 16) на прэзентацыю зборніка «Достояние», прысвечанага Л. М. Талстому. Пачатак у 13.00.

7 кастрычніка — на духоўна-асветніцкае мерапрыемства ў межах Дзён праваслаўнай культуры, якое адбудзецца ў Нацыянальным мастацкім музеі (вул. Леніна, 20). Пачатак у 15.00.

10 кастрычніка — у Цэнтральную мінскую гарадскую бібліятэку імя Я. Купалы на «Восеньскія паэтычныя чытанні» (вул. Веры Харужай, 16). Пачатак у 16.20.

11 кастрычніка — у Дом літаратара (вул. Фрунзэ, 5) на вечар беларускай і башкірскай паэзіі і музыкі з удзелам дэлегацыі Башкартастана. Пачатак у 17.00.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламедаў, Вольга Дадзіёмава, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі: Юрыдычны адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны: галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы: 63856 — індывідуальны; 63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў; 638562 — ведамасны; 63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"». Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 05.10.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 661

Друкарня Рэспубліканская ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецт-ва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 2401

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686